ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

НЯДЗЕЛЯ, 23 КАСТРЫЧНІКА 1938 г. № 58 (400)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ РАЗГАРНУЦЬ ТВОРЧУЮ РАБОТУ

З ростам соцыялістычнай краіны расце і мужнее совецкая літаратура. З'яўляючыся неад'емнай часткай соцыялістычнага будаўніцтва, совецкая літаратура, выпеставаная партыяй Леніна — Сталіна, за гэтыя годы стварыла не мала хвалюючых твораў аб геройчнай барацьбе свайго народа за права на шчаслівае жыццё.

З ростам усёй краіны расла і совецкая беларуская літаратура. Атрымліваючы штодзённую дапамогу ад вялікай братняй рускай літаратуры, ведучы разам са сваім народам бязлітасную барацьбу супроць ворагаў усякіх масцей і адценняў, загартоўвалася і ўзмацнялася совецкая беларуская літаратура.

Разгром органамі НКВД асіных гнёздаў ворагаў на літаратурным фронце з'явіўся вялікай творчай зарадкай для совецкіх пісьменнікаў Беларусі. За апошні час беларускія паэты і пісьменнікі напісалі такія творы, як калектыўная паэма «Радзіме і правадыру», раман «Будучыня» Э. Самуйлёнка, паэмы «Кацярына» П. Броўкі і «У зялёнай дуброве» А. Куляшова, новыя вершы Я. Купалы, Я. Коласа і інш.

Але ніяк нельга сказаць, што Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР і яго секцыі з поспехам справіліся з ускладзенымі на іх задачамі. Аб тым, што творчая атмасфера ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР яшчэ не створана, указвалі нядаўна «Литературная газета» (орган ССП СССР) і газета «Звязда». Аб гэтым неаднаразова сігналізавала і наша газета.

Адсутнасць кіраўніцтва з боку праўлення ССПБ прывяло да заняпаду дзейнасць творчых секцый, гэтых асноўных цэхаў работы саюза з рукапісам, з аўтарамі. Секцыя саюза пісьменнікаў — гэта першае звяно, самае важнае і галоўнае, дзе павінны кіраваць творчай работай кожнага члена саюза, аказваць яму творчую дапамогу і правільна арыентаваць яго пры разборы твораў. Іменна сюды павінен звяртацца пісьменнік, тут павінен ён дзяліцца сваімі творчымі замысламі і атрымаць карысную таварыскую заўвагу, дзейсную дапамогу.

На жаль, секцыі ССПБ слаба займаюцца асноўнымі і кроўнымі сваімі пытаннямі і мала аддаюць увагі ўжо створанаму твору, гатоваму рукапісу, падрыхтаванаму пісьменнікам. Над чым хто працуе і якую мае патрэбу ў творчай ці якой іншай дапамозе (скажам, падборы пэўнага матэрыялу) — як у саюзе, так і ў секцыях не ведаюць.

Паэтычная секцыя — самая вялікая ў саюзе. Што-ж прарабіла секцыя за апошні час? Гэтымі днямі адбылося чарговае пасяджэнне секцыі. Абмяркоўваўся план работы на бягучыя тры месяцы. Побач з намячэннем канкрэтных мерапрыемстваў (арганізацыя гарадскіх вечароў, брыгад для падрыхтоўкі перакладаў твораў В. В. Маякоўскага і М. Ю. Лермантава на беларускую мову) былі прыняты і такія, з дазволу сказаць, рашэнні: «Прыняць да ведама», «перанесці на праўленне ССПБ».

Набліжаецца 20-я гадавіна стварэння совецкай беларускай дзяржаўнасці. Замест канкрэтнага абмеркавання, хто над чым будзе працаваць, секцыя запісала рашэнне: «Прыняць да ведама».

Абмеркаваць-жа новыя творы, у прыватнасці «Кацярыну» П. Броўкі і «У зялёнай дуброве» А. Куляшова, секцыя не знайшла часу, перадаручыла сваю-ж кроўную справу праўленню саюза. За гэты год секцыя паспела абмеркаваць толькі творчасць Э. Агняцвет і паэму Жаўрука «Крывёю сэрца».

Сярод маладых пачынаючых паэтаў ёсць рад здольных таварышоў. Секцыя за год ні разу не знаёмілася з іх творчасцю. Секцыя не займаецца выхаваннем новых кадраў, лічачы, што гэтым пытаннем павінен займацца выключна габінет маладога аўтара, які, дарэчы, са сваёй работай не спраўляецца. Пара расчыніць дзверы секцыі для маладых аўтароў, пара ўцягнуць іх у творчую работу.

Трэба сур'ёзна падумаць секцыі і аб прыцягненні маладых паэтаў для перакладу твораў В. В. Маякоўскага, М. Ю. Лермантава і інш. Трэба секцыі цікавіцца не толькі творчым, але і палітычным тварам сваіх членаў, рашуча ачышчаючы свае рады ад усяго варожага, ліквідуючы рэшткі групаўшчыны і шкодніцтва на паэтычным фронце.

У мінулым годзе багата было абяцанняў перакласці на беларускую мову асноўныя творы А. С. Пушкіна. Прайшоў юбілей і пра абяцанне ў Саюзе пісьменнікаў забыліся. Секцыя перакладчыкаў магла-б тут аказаць неабходную дапамогу.

Вялікую шкоду секцыям, як і ўсёй беларускай літаратуры, прынеслі ворагі народа, зараз выкрытыя слаўнымі органамі НКВД. Вядома, што ў паэтычнай секцыі доўгі час знаходзіліся фашысцкія агенты. Ворагі арыентавалі секцыю на габінетную творчасць, на халтуру, на нізкапробнае трубадурства і барабаншчыну. Секцыя зрабіла вельмі мала па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў паэзіі.

Не так даўно ў драматычнай секцыі быў выкрыт заядлы вораг, агент нацыянал-фашыстаў, які больш дзесятка год плёў свае аповесці і п'есы і лічыўся недатыкальным для крытыкі. Гэта сцвярджае аб тым, што ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі адсутнічае палітычная пільнасць і няма дзелавой прынцыповай крытыкі — крытыкі не па рангах, а па якасці твораў.

Перад драматургічнай секцыяй стаяць вялікія і адказныя задачы. У будучым годзе ў Маскве адбудзецца дэкада мастацтва беларускага народа. Задача састаіць у тым, каб прыйсці да гэтай дэкады з высокаякасным рэпертуарам, вартым нашай дзівоснай сталінскай эпохі і геройчнага беларускага народа. Закляты вораг, які прабраўся ў кіраўніцтва секцыяй, усялякім чынам зрываў выкананне гэтай пачэснай задачы, праціхваючы на сцэну сваю нізкапробную пісаніну. Драматургічная секцыя павінна неадкладна заняцца ліквідацыяй вынікаў шкодніцтва ў совецкай беларускай драматургіі, прыцягнуць да работы маладых аўтароў, з якімі яна да гэтага часу не займалася, наладзіць цесную сувязь з тэатрамі, пабудаваць сваю работу так, каб стварыць высокаякасны, хвалюючы рэпертуар да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

Зусім недапушчальнае становішча і ў крытычнай секцыі. Гэта секцыя заклікана разам з пісьменнікамі ствараць хвалюючыя, поўныя страсці і чалавечнасці кнігі пра геройзм совецкага народа, пра патрыятызм яе сыноў, адвагу і мужнасць. Але секцыя крытыкаў стаіць у баку ад літаратурнага жыцця. Яна часам толькі канстатуе той ці іншы літаратурны факт альбо з'яву. Не было яшчэ такога факта, каб крытыкі дапамагалі пісьменніку ў працэсе яго работы над рукапісам, каб цікавіліся творчай работай пісьменніка. Не было яшчэ такога схода крытыкаў, на якім стаяла-б пытанне сур'ёзна аб крытыцы, аб рукапісу пісьменніка. Секцыя крытыкаў замкнута, яна не звязана са здольнай літаратурнай моладдзю. Секцыя крытыкаў не праводзіць абсалютна ніякай работы па выхаванню новых кадраў. Яна не прыцягвае да работы ў секцыі нават тых таварышоў, якія змяшчаюць свае артыкулы ў перыядычным друку. Больш таго, — лічацца ў актыве Саюза пісьменнікаў і секцыі людзі, якія за апошнія год—два не напісалі ніводнага крытычнага артыкула.

Вельмі важная задача ўскладаецца на крытыкаў у справе падрыхтоўкі і выдання падручніка па гісторыі беларускай літаратуры. Секцыя крытыкаў разам з усім саюзам павінна па-большэвіцку ўзяцца за выкананне адказнай задачы—стварэння падручніка па беларускай літаратуры.

Абсалютна недапушчальна і тое, што, не гледзячы на шматлікія сігналы, праўленне ССПБ не патурбавалася арганізаваць такую важную секцыю, як абаронная. Гэта можна вытлумачыць толькі палітычнай бестурботнасцю кіраўнікоў праўлення ССПБ. На небасхіле палае крывавае зарава вайны. Абаронная літаратура павінна быць у цэнтры ўвагі ўсяго Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі. Аднак, абаронная секцыя чамусьці не знайшла свайго законнага права на існаванне па сёнешні дзень.

Не лепшыя справы і ў секцыі празаікаў і ў яўрэйскай секцыі Саюза пісьменнікаў. Вядома, што і секцыя празаікаў і яўрэйская секцыя былі засмечаны класава-варожымі элементамі. Гэта абавязвала і кіраўнікоў секцый (тт. Лынькоў, Камянецкі) і праўленне ССПБ у корані перабудаваць работу секцый, па-большэвіцку ўзяцца за ліквідацыю рэштак шкодніцтва. Але секцыя празаікаў на працягу года нават не збіралася на пасяджэнні.

Не цікавіцца праўленне ССПБ творчай работай яўрэйскай секцыі. Ёсць у яўрэйскай секцыі людзі, якія па два гады і больш нічога не пішуць, а калі і пішуць, дык аб усім, але толькі не аб совецкай рэчаіснасці.

На мала лепш абстаіць справа і з секцыяй дзіцячай літаратуры.

Неабходна падумаць і пра арганізацыю рускай секцыі пры праўленні ССПБ. Шмат хто піша на рускай мове, але гэтыя здольныя таварышы не арганізаваны і не знаходзяць ніякай дапамогі ў Саюзе пісьменнікаў БССР. Нават габінет маладога аўтара не займаецца з таварышамі, якія пішуць свае творы на рускай мове, а накіроўвае іх у рэдакцыі газет «Советская Белоруссия» і «Сталинская молодежь».

Адарванасць некаторых пісьменнікаў ад совецкай рэчаіснасці прывяла да таго, што гэтыя пісьменнікі не падымаюць у сваіх творах актуальныя тэмы сёнешняга дня. І не дзіўна, што тэматыка беларускіх і яўрэйскіх пісьменнікаў БССР вузкая і абмежаваная. У нас амаль няма манументальнага палатна (аповесці, паэмы, п'есы) аб рабочым класе Совецкай Беларусі, аб заможным калгасным жыцці, аб стварэнні беларускай дзяржаўнасці, аб правадырах народа і героях. Такія творы неабходна стварыць.

Работу секцый Саюза совецкіх пісьменнікаў трэба неадкладна перабудаваць, рашуча ўзмацніўшы кіраўніцтва імі з боку праўлення ССПБ.

Совецкаму пісьменніку партыя Леніна — Сталіна, совецкі ўрад стварылі ўсе ўмовы для работы, абкружылі іх клопатамі і ўвагай, аказваюць вялікае давер'е і гэта давер'е беларускія пісьменнікі павінны апраўдаць, выканаўшы свой доўг перад соцыялістычнай радзімай.

ПРЫВІТАННЕ ПРАЦОЎНЫХ ХАБАРАЎСКА *таварышу Сталіну*

Мы, працоўныя горада Хабараўска—рабочыя, работніцы, служачыя, совецкая інтэлігенцыя, байцы, камандзіры і палітработнікі Хабараўскага гарнізона, сабраўшыся на агульнагарадскі мітынг сустрэчы з геройчным экіпажам самалёта «Родина» тт. Валянцінай Грызадубавай, Палінай Осіпенка і Марынай Расковай, шлем Вам, наш родны бацька і настаўнік, палкае большэвіцкае прывітанне!

З пачуццём найвялікшай радасці сустракаем мы сёння геройчных дачок нашай цудоўнай радзімы, выхаваных вялікай партыяй Леніна—Сталіна, выпеставаных Вашымі бацькоўскімі клопатамі.

Ваша імя, таварыш Сталін, натхняе верных сыноў і дачок нашай вялікай радзімы на новыя геройчныя подвігі.

З Вашым імем у сэрцах геройні паветра зрабілі беспрыкладны пералёт Масква—Далёкі Усход, упісаўшы яшчэ адну геройчную старонку ў гісторыю нашай совецкай авіяцыі.

Гэты выдатны пералёт яшчэ раз паказаў усяму свету адзінства нашага совецкага народа, несакрушальную магутнасць нашай вялікай радзімы.

Разам з усім совецкім народам мы ганарымся беспрыкладнай мужнасцю, адвагай і высокім лётным майстэрствам слаўнага экіпажа самалёта «Родина». Ні адзін лётчык у свеце не акружан такімі штодзённымі бацькоўскімі клопатамі, як у нашай краіне.

Толькі ў краіне соцыялізма, дзе перад совецкімі жанчынамі адкрыты ўсе дарогі да вышынь навукі і тэхнікі, магчымы такія геройчныя пералёты.

Наша краіна — краіна герояў.

Няма большага шчасця, чым жыць і працаваць у сталінскую эпоху!

Натхнёныя геройчным пералётам слаўнага экіпажа самалёта «Родина», мы, працоўныя Далёкага Усхода, байцы, камандзіры і палітработнікі Чырвонасцяжных Армій, запэўняем Вас, таварыш Сталін, што яшчэ больш будзем мацаваць магутнасць нашай слаўнай авіяцыі, абараназдольнасць нашай цудоўнай радзімы і яе фарпоста на Ціхім акіяне нашага выдатнага Далёкага Усхода.

Гонар і слава геройчным дочкам совецкага народа, слаўным пітомцам большэвіцкай партыі!

Няхай жыве вялікая непераможная партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве наш родны бацька і настаўнік вялікі Сталін!

Прынята 17 кастрычніка 1938 г. на агульнагарадскім мітынгу працоўных гор. Хабараўска. На мітынгу прысутнічала звыш 100 тысяч чалавек.

ПРЫВІТАННЕ ПРАЦОЎНЫХ ХАБАРАЎСКА *таварышу Варашылаву*

Мы, працоўныя горада Хабараўска—байцы, камандзіры і палітработнікі Чырвонасцяжных Армій, сёння перажываем вялікую радасць: мы сустракаем геройчны экіпаж «Родины»—смелых і бясстрашных дочак нашага вялікага совецкага народа.

Мужныя і самаадданыя, выхаваныя комуністычнай партыяй і таварышам Сталіным, яны ўпісалі сваім бясстрашным подвігам яшчэ адну старонку ў слаўную летапісь магутнасці, сілы і непераможнасці краіны соцыялізма.

Валянціна Грызадубава, Паліна Осіпенка і Марына Раскова — гэтыя сталінскія сокалы — яшчэ раз паказалі ўсяму свету, на што здольны свабодныя і роўнапраўныя совецкія жанчыны і такіх жанчын мы па праву называем геройнямі і ганарымся імі.

У мінуту грознай небяспекі, калі японскія самураі зноў паспрабуюць напасці на краіну Советаў, — дзесяткі, сотні і тысячы герояў паднімуцца ў паветра і павядуць магутныя грозныя самалёты да граніц квітнеючага Далёкага Усхода. Увесь многамільённы народ несакрушальнай жалезнай сцяной устане на абарону свяшчэнных рубяжоў нашай радзімы. Вораг будзе разбіт і знішчан таксама, як ён быў разбіт і вышвырнут з нашай дарагой зямлі ў часе падзей у раёне возера Хасан.

Працоўныя Далёкага Усхода, байцы, камандзіры і палітработнікі Чырвонасцяжных Армій запэўняюць Вас, дарагі таварыш Варашылаў, што яны па першаму закліку партыі і ўрада і Вас, жалезнага Наркома абароны, устануць у рады актыўных барацьбітоў з ворагам, калі ён паспрабуе на нас напасці.

За нашу цудоўную радзіму, за наш родны і блізкі Далёкі Усход аддадзім усе свае сілы, а калі патрэбуецца — і жыццё!

Няхай жывуць нашы доблесныя геройні — таварышы Грызадубава, Осіпенка і Раскова!

Няхай жыве партыя Леніна—Сталіна, выхаваўшая такіх герояў!

Няхай жыве магутная, непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і яе жалезны сталінскі нарком таварыш Варашылаў!

Няхай жыве наш друг, бацька і настаўнік — родны таварыш Сталін!

Прынята 17 кастрычніка 1938 года на агульнагарадскім мітынгу працоўных гор. Хабараўска. На мітынгу прысутнічала звыш 100 тыс. чалавек.

ГЕРАІЧНЫ ЭКІПАЖ САМАЛЁТА „РОДИНА" ВЫЕХАЎ У МАСКВУ

ХАБАРАУСК. 19 кастрычніка. Сёння працоўныя Хабараўска праводзілі ў Маскву адважны экіпаж самалёта «Родина». Тысячы працоўных горада сабраліся на прывакзальнай плошчы, каб яшчэ раз убачыць дарагія твары слаўных геройнь, перадаць з імі прывітанне роднай Маскве, таварышу Сталіну.

Мітынг адкрыў сакратар Далёкаўсходняга крайкома ВКП(б) тав. Собалеў. Ён пажадаў адважным лётчыцам шчаслівага звароту ў чырвоную сталіцу і прасіў іх перадаць гарачае прывітанне ленінска-сталінскаму ЦК партыі, ураду і таварышу Сталіну ад працоўных і Чырвонасцяжных Армій Далёкага Усхода.

Ад імя доблеснага экіпажа выступіла тав. Паліна Осіпенка.

— Мы спяшаемся ў чырвоную сталіцу, — гаворыць яна. — каб далажыць партыі, ураду і таварышу Сталіну аб выкананні даручанага нам задання. Сардэчна дзякуем працоўных, байцоў, камандзіраў і палітработнікаў, партыйныя арганізацыі Далёкага Усхода за аказаную дапамогу, цёплую сустрэчу і прыём.

Мы перададзім ураду і любімаму Сталіну, што працоўныя Далёкага Усхода моцна згуртаваны вакол комуністычнай партыі, што непераможныя чырвонаармейскія палкі, паветраны і ваенна-марскі флоты пільна ахоўваюць совецкія граніцы. Калі подлыя фашысцкія сцервятнікі яшчэ раз паспрабуюць напасці на нашу радзіму, то працоўныя Далёкага Усхода разам з усім народам дадуць ім сакрушальны адпор.

Тав. Осіпенка агалашае здравіцу ў гонар партыі большэвікоў, таварыша Сталіна, непераможнай Чырвонай Арміі, Паветранага і Ваенна-марскога флотаў і маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава.

Мітынг закончан. Лётчыцы і суправаджаючыя ідуць к поезду.

Адважны экіпаж самалёта «Родина» выехаў у Маскву.

***

КУИБЫШЭУКА УСХОДНЯЯ, 20 кастрычніка. Поезд з адважным экіпажам «Родины» мчыцца да Масквы. Прайшла першая ноч шляху.

Раніцою на станцыі Завітай адбыўся многалюдны мітынг. Адважныя лётчыцы стаяць на падножках вагона, а насустрач ім нясуцца прывітанні.

У ТАЙЗЕ

ВЕРШ А. РУДОГА

***

Дзе ні глянь — не відаць нічога.
Абступіла тайга, не прайсці.
Як знайсці да жылля дарогу?
Як сяброўак сваіх знайсці?
Разважала Раскова Марына
Размаўляла з сабою адна...
А ў адказ ёй тайга гаманіла,
Прагудзела, здалося, яна:
«Я не выдам цябе нікому,
Як дачку ў сябе прытулю.
Не турбуйся і будзь як дома.
Раскладзі, каб сагрэцца, агню.
Ты адважная, смелая — знаю,
Ты зрабіла геройскі палёт.
Уся краіна цябе шукае,
Уся краіна цябе чакае,
Родны Сталін цябе чакае,
І вялікі совецкі народ...
І развеяны смутак шумам,
Светляком бліщчыць агонь.
А Марына ляціць у думах
Да любімага бацькі свайго.
«Мо' цяпер ён не спіць начамі;
Ён працуе ў светлым Крэмлі.
І цяпер ён у нас і з намі,
Яго імя ў сэрцы маім»...
А світанне зямлю абнімала
Незаметна. Таежная цень,
Паступова, як хмарка, знікала
Нараджаўся прывабліўы дзень.
Раптам гул — і над самай тайгою
Смела песню маторы пяюць.
Вось яны над яе галавою,
Нібы лебедзі, горда плывуць
Зззяюць чырванню зоркі на крыллях
Фюзеляжы, як срэбра, блішчаць
— Гэта наша... свая эскадрылля
Гэта Сталін паслаў іх шукаць.
Усё злілося ў радасны згустак.
У Марыны ні каплі тугі.
І яна беласнежнаю хусткай
Прывітала гасцей дарагіх...

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
Аб устанаўленні медалі „За отвагу"

1. Устанавіць медаль «За отвагу».
2. Зацвердзіць Палажэнне аб медалі «За отвагу», яе рысунак і апісанне.

Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Г. ПЕТРОУСКІ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль, 17 кастрычніка 1938 г.

Палажэнне аб медалі „За отвагу"



1. Медаллю «За отвагу» ўзнагароджваюцца ваеннаслужачыя радавога, каманднага і начальніцкага састава Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, Ваенна-Марскога Флота і Войск пагранічнай аховы за асабістую мужнасць і адвагу ў баях з ворагамі Совецкага Саюза на тэатры ваенных дзеянняў, пры абароне недатыкальнасці дзяржаўных граніц або пры барацьбе з дыверсантамі, шпіёнамі і іншымі ворагамі Совецкай дзяржавы.
2. Узнагароджанне медаллю робіцца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР.
3. Узнагароджаным медаллю выплачваецца за кошт дзяржавы па 10 рублёў у месяц. Выплата праводзіцца ашчаднымі касамі.
4. Узнагароджаныя медаллю карыстаюцца асабіста правам бясплатнага праезду ў трамваях ва ўсіх гарадах СССР.
5. Медаль носіцца на левым баку грудзі.
6. Нашэнне медалі абавязкова на парадах, рэволюцыйных святах і ўрачыстых пасяджэннях.
7. Пазбаўленне медалі робіцца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР.
8. Узнагароджаныя медаллю павінны падаваць асабісты прыклад храбрасці, мужнасці і адвагі ў барацьбе з ворагамі Совецкай дзяржавы і служыць узорам для іншых грамадзян пры выкананні дзяржаўных абавязкаў.

Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР. Г. ПЕТРОУСКІ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 17/X—1938 г.

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
Аб устанаўленні медалі „За боевые заслуги"

1. Устанавіць медаль «За боевые заслуги».
2. Зацвердзіць Палажэнне аб медалі «За боевые заслуги», яе рысунак і апісанне.

Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Г. ПЕТРОУСКІ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль, 17 кастрычніка 1938 г.

Палажэнне аб медалі „За боевые заслуги"



1. Медаллю «За боевые заслуги» ўзнагароджваюцца ваеннаслужачыя радавога, каманднага і начальніцкага састава Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, Ваенна-Марскога Флота і Войск пагранічнай аховы, а таксама асобы, якія не знаходзяцца ў радах Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, Ваенна-Марскога Флота і Войск пагранічнай аховы, якія ў барацьбе з ворагамі Совецкай дзяржавы сваімі ўмелымі, ініцыятыўнымі і смелымі дзеяннямі, звязанымі з рызыкай для іх жыцця, садзейнічалі поспеху баявых дзеянняў на фронце.
2. Узнагароджанне медаллю робіцца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР.
3. Узнагароджаным медаллю выплачваецца за кошт дзяржавы па 5 рублёў у месяц. Выплата праводзіцца ашчаднымі касамі.
4. Узнагароджаныя медаллю карыстаюцца асабіста правам бясплатнага праезду ў трамваях ва ўсіх гарадах СССР.
5. Медаль носіцца на левым баку грудзі.
6. Нашэнне медалі абавязкова на парадах, рэволюцыйных святах і ўрачыстых пасяджэннях.
7. Пазбаўленне медалі робіцца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР.
8. Узнагароджаныя медаллю павінны насіць яе з гонарам і служыць прыкладам добрасумленнасці і акуратнасці пры выкананні дзяржаўных абавязкаў.

Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Г. ПЕТРОУСКІ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 17/X—1938 г.

***

„ЧАЛАВЕК З РУЖЖОМ"



У ролі В. І. ЛЕНІНА — артыст Малчанаў. Шадрын — арт. Звездачотаў.

***

17 кастрычніка адбыўся закрыты прагляд п'есы Нікалая Пагодзіна «Чалавек з ружжом», пастаўленай Віцебскім Беларускім драмтэатрам, рэжысёрамі І. Віньярам і Б. Тамарыным.

У гэтай пастаноўцы ўпершыню на сцэне беларускага тэатра паказаны вобразы геніяў чалавецтва Леніна і Сталіна.

Партыйны актыў гор. Менска, які прысутнічаў на праглядзе, цёпла сустрэў паказ і горача вітаў актораў, якія ўзяліся за гэту адказную і пачэсную работу.

Ролю Леніна выконвае артыст П. С. Малчанаў, ролю чалавека з ружжом Шадрына — арт. Н. П. Звездачотаў, ролю Чыбісава—арт. А. Г. Шэлег, ролю Надзі — Р. Н. Кашэльнікава, ролю Каці — М. С. Белінская, ролю Дымава— А. Трус, ролю матроса ля тэлефона — С. В. Скальскі, ролю сакратара штаба Смольнага — З. С. Велікі, ролю меншавіка — Ц. Н. Сяргейчык.

На праглядзе прысутнічалі сакратар ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка і Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Наталевіч.

Калектыў тэатра выехаў у Віцебск, дзе будзе прадаўжаць работу над спектаклем. Прэм'ера адбудзецца ў Менску ў дні XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

ГОРКІ—ГІСТОРЫК ЛІТАРАТУРЫ

«Любіць справу, — пісаў Горкі, — гэта значыць адчуваць яе неабходнасць для жыцця» Такой любоўю Горкі любіў літаратурную справу.

Усе вялікія рускія пісьменнікі, прасякнутыя ўсведамленнем неабходнасці літаратуры для жыцця, займаліся яе гісторыяй і тэорыяй, былі рэцэнзентамі крытыкамі. рэдактарамі Горкі сярод іх — першы; ён любіў літаратурную справу так, як толькі можа любіць пісьменнік змагар за комунізм, які разумеў усё значэнне мастацкага слова ў вызваленчай барацьбе чалавецтва. Горкі служыў літаратуры не толькі сваёй вялікай мастацкай творчасцю, але і як гісторык літаратуры, тэарэтык. крытык, рэдактар, публіцыст, арганізатар.

У архіве Горкага захоўваецца рукапіс яго гісторыі рускай літаратуры XVIII і XIX стагоддзяў. над якой пісьменнік працаваў і 1908—1909 гадах Рукапіс чарнавы, няпоўны: многія раздзелы, асобныя старонкі згублены. Тым не менш ён дае звязанае, яснае выкладанне ўсіх важнейшых літаратурных падзей двух стагоддзяў і ўяўляе выдатную цікавасць.

Перад намі не збор партрэтаў пісьменнікаў, не разрозненыя раздзелы, прысвечаныя тым ці іншым напрамкам, — перад намі гісторыя літаратуры, як «адлюстраванне сацыяльных з'яў». Горкі высоўвае важнейшыя баявыя сацыяльныя пытанні і вакол іх групіруе творы пісьменнікаў, літаратурныя напрамкі. На шырокім гістарычным фоне грамадскага жыцця і барацьбы, як яе ўдзельнікі, выступаюць Фанвізін, Пушкін. Лермантаў, Тургенеў, Герцэн, Леў Талстой.

Горкі ўскрывае законамернасць развіцця літаратуры: ён паказвае, як адны ідэі і формы мастацкай творчасці змяняліся другімі, ён ускрывае іх пераемнасць, ацэньвае пісьменнікаў, як сыноў сваёй эпохі, сваёй краіны і як удзельнікаў сусветна-гістарычнага працэса.

Так, расказваючы аб дасягненнях буржуазнага рэалізма ў той час, калі маладая, ваяўнічая буржуазія перамагала феадальны лад, Горкі піша:

«Чытач быў здзіўлен гэтай блізкасцю кнігі да жыцця. Рэаліст сваёй дзейнасці, ён чытаў з задаволеннем і велізарнай карысцю: кніга дапамагала яму разумець складаныя адносіны людзей, дапамагала будаваць тую сістэму адносін да блізкіх, якую мы завем буржуазнай праўственасцю,... дапамагала яму стварыць ідэалогію індывідуалізма, — сістэму самаабароны буржуа ад напору на яго сацыяльна-дэмакратычных патрабаванняў.

Апрача блізкасці да жыцця, новая літаратура прынесла з сабой чытачу новую эстэтыку, новую прыгажосць.. Гэта была... прыгажосць будняга дня, напоўненага жывой творчай работай юнага, здаровага грамадства, якое атрымлівала асалоду ад сузірання сваіх будаўнічых намаганняў і яўнымі для ўсіх рэзультатамі іх...»

А побач з гэтай характарыстыкай росквіту літаратуры буржуазіі Горкі вызначае тыя карэнныя рысы яе сацыяльнай практыкі, якія абмежавалі яе мысль.

«Характар драпежніцкай псіхікі буржуазіі выяўляецца, — піша Аляксей Максімавіч, — і ў галіне будавання ідэалогіі... Будуючы свае тэорыі, буржуа-філосаф і вучоны — не можа карыстацца ўсёй масай агульначалавечага вопыту,... аб'ектыўнасць варожа яму».

На прыкладзе заходнееўрапейскай літаратуры пачатку XIX стагоддзя і рускай літаратуры пачатку XX стагоддзя Горкі паказвае, як на змену буржуазнаму рэалізму прыходзіць і побач з ім існуе рэакцыйны рамантызм.

У той літаратуры, якую звычайна называюць рамантычнай. Горкі адрозніваe два проста супроцьлеглых напрамкі Адзін узнікае як выражэнне рэакцыйных імкненняў; ён адводзіць ад рэчаіснасці, прапаведвае рэлігію і містыку, індывідуалізм і нацыяналізм, Другі «ўзнікае на глебе ўсведамлення чалавекам яго сувязі з светам і адчування сваёй творчай сілы...»

Гэты від рамантызма нараджаецца ў пролетарскай літаратуры. Так, яшчэ ў 1908 годзе Горкі фармуліруе сутнасць рэволюцыйнага рамантызма.

«І няхай не здзіўляе вас, — піша ён, — прыстасаванне тэрміна рамантызма да псіхалогіі пролетарыята. Тэрмінам гэтым, з прычыны адсутнасці другога, я вызначаю толькі павышаны баявы настрой пролетарыя, выцякаючы



з усведамлення ім сваіх сіл, з усё больш засвойваемага ім погляду на сябе, як на гаспадара свету і на вызваліцеля чалавецтва».

Горкі канкрэтны ў сваёй рабоце па гісторыі літаратуры; ён свабодны ад схематызма. Разглядаючы літаратуру як адлюстраванне класавых адносін, ён тлумачыць яе ўсёй сукупнасцю сацыяльных умоў: эканомікай, палітыкай царызма, барацьбой народных мас, ідэйнымі ўплывамі. Горкі пры гэтым не выпускае з-пад увагі таксама асаблівасцей біяграфіі пісьменніка, яго творчай індывідуальнасці.

Выдатны горкаўскія характарыстыкі Пушкіна, Лермантава, Герцэна, Льва Талстога.

Горкі гаворыць пра Пушкіна як пра паэта, для якога літаратура была нацыянальнай справай першаступеннай важнасці. як пра вялікага пісьменніка-рэаліста, зразумеўшага сацыяльную духоўную магутнасць народа. Вызначаючы значэнне Пушкіна, Горкі параўноўвае яго з Леанардо да Вінчы і Мікель Анджэло.

«Перад намі..., — піша ён, — вялікі рускі народны паэт, стваральнік чаруючых прыгажосцю і розумам казак, аўтар першага рэалістычнага рамана— «Еўгеній Онегін», аўтар лепшай нашай гістарычнай драмы — «Барыс Гадуноў», паэт да гэтага дня нікім не пераўзыйдзены ні ў прыгажосці верша, ні ў сіле выражэння пачуцця і мыслі, паэт — родапачынальнік вялікай рускай літаратуры».

Лермантава Горкі лічыць «вартым пераемнікам Пушкіна». Лермантаўскі песімізм ён разглядае як «дзейснае пачуццё».

«У гэтым песімізме ясна гучыць пагарда да сучаснасці, — і адмаўленне яе, прага барацьбы, і туга, і роспач ад усведамлення адзіноцтва, ад усведамлення бяссілля...»

Ствараючы творчы партрэт Л. Талстога. Горкі з усёй сілай навальваецца на талстоўшчыну, ускрывае яе рэакцыйнасць, але тут-жа ўказвае, што «мысль Талстога накіроўвалася заўсёды па лініі інтарэсаў сялянскіх мас». Горкі супадае з Леніным у сваёй ацэнцы Талстога. «Накот Талстога,— пісаў Ленін Горкаму ў 1911 годзе, — цалкам падзяляю Вашу думку»...

Горкі гаворыць аб Талстым як аб мастаку, чые творы напісаны з вялікай. амаль цудоўнай сілай, як аб універсальным геніі мастацкага слова:

«Талстой глыбока нацыянальны, ён са здзіўляючай паўнатой увасабляе ў сваёй душы ўсе асаблівасці складанай рускай псіхікі: у ім ёсць буйнае азарство Ваські Буслаева і ціхамірная ўдумлівасць Нестара-летапісца, у ім гарыць фанатызм Авакума, ён скептык, як Чаадаеў, паэт не менш, чым Пушкін, і разумны, як Герцэн. Талстой — гэта цэлы свет»..

«Крок наперад у мастацкім развіцці ўсяго чалавецтва», — сказаў аб ім Ленін.

Горкі дае ў сваёй гісторыі літаратуры невялікія гістарычныя нарысы, характарыстыкі этапаў грамадскага развіцця. Яны жывыя і поўныя глыбокага сэнсу. Пісьменнік паказвае. як ствараліся тыповыя характары розных класаў. І больш яснымі, зразумелымі паўстаюць перад чытачом вобразы, створаныя мастакамі мінулага. Адзначаючы расслаенне разначынцаў у 40—50-я годы мінулага стагоддзя на групу рэволюцыйных дэмакратаў і групу, служыўшую дваранска-бюракратычнай Расіі, Горкі паказвае, як адны і тыя-ж умовы «барацьбы за кус хлеба» стварылі розныя сацыяльныя характары.

«...З'яўляліся людзі з гордай самаадзейнай сілай, яны ішлі наперад сваім шляхам, не спатыкаючыся аб развалiны мінулага, а свой шлях у той час мог быць толькі адзін — да народа, да масы сялянскай, значыць, перш за ўсё, — супроць прыгоннага права»...

Але прыгонны саслоўны гнёт, поўнае бяспраўе стварылі і другога чалавека: «духоўна слабага», які падпарадкоўваўся волі «людзей моцных і людзей сытых», чалавека дваістага, з няўстойлівай псіхікай, індывідуаліста да мозгоў касцей. Ён прадстае, раскрыты Горкім. у раздзелах, прысвечаных дробнабуржуазнай інтэлігенцыі і яе літаратуры.

У сваёй гісторыі літаратуры Горкі падкрэслівае, што буйнейшыя нашы пісьменнікі не праходзілі міма сялянства. Становішча, праца і барацьба народных мас проста ці ўскосна вызначалі развіццё рускай літаратуры.

Разам з тым Горкі вялікую ўвагу ўдзяляе рускай інтэлігенцыі. Ён ускрывае яе расслаенне: вылучае групу, што ідзе да народа, поўную баявога дэмакратызма. І сакрушальнай крытыцы, бязлітаснаму аналізу падвяргае Горкі мяшчанскую інтэлігенцыю.

Выкрыццё індывідуалізма — вялікая задача гісторыі літаратуры Горкага.

Выдатную цікавасць уяўляе раздзел, прысвечаны «дваранскай самакрытыцы», таксама звязаны з задачай выкрыцця індывідуалізма. Горкі аналізіруе ў гэтым раздзеле тыпы так званых «лішніх людзей» — Онегіна, Пячорына, Рудзіна, Бельтава. Нельга больш глыбока і трапна вызначыць змест і значэнне гэтых вобразаў, чым гэта зрабіў Горкі.


Горкі на прыкладзе Бельтава, героя герцэнаўскага рамана «Хто вінаваты?» ускрывае гістарычныя ўмовы, парадзіўшыя «лішняга чалавека» — гэту «разумную непатрэбнасць», расказвае аб драме «разумнай непатрэбнасці», а разам з тым праводзіць мысль— «індывідуалізм стварае «лішніх людзей».

Гісторыя літаратуры Горкага працізана рэволюцыйнай мэтанакіраванасцю. Ад яе вее духам класавай барацьбы. яна накіравана да адной мэты — узброіць такім разуменнем літаратуры, такімі ведамі ў гэтай галіне, якія не толькі тлумачаць свет. але дапамагаюць яго змяніць, дапамагаюць будаваць новае жыццё, як гаварыў Горкі. на «рэальных пачатках» — свабоднай працы, інтэрнацыяналізма,— пачатках соцыялістычнага ладу.

М. ЮНОВІЧ.
(«ПРАВДА»).

М. М. БЛЮМЕНТАЛЬ-ТАМАРЫНА

16 кастрычніка ў Маскве, у крэмлёўскай больніцы скончалася народная артыстка СССР — ордэнаносец Марыя Міхайлаўна Блюменталь-Тамарына.



ВЫДАТНАЯ АРТЫСТКА

Марыя Міхайлаўна Блюменталь-Тамарына была народнай артысткай Савецкага Саюза ў самым поўным, глыбокім значэнні гэтага слова. Усе тыя, хто меў шчасце працаваць разам з ёю, ніколі не забудуць яе, як не забудзе яе гісторыя тэатра, у якую яе імя ўпісана назаўсёды.

Марыя Міхайлаўна нарадзілася ў Пецярбургу ў 1859 годзе. Яшчэ дзіцём яна ўдзельнічала ў аматарскіх спектаклях. У 1880 годзе, выйшаўшы замуж за вядомага артыста А. Э. Блюменталь-Тамарына, яна непасрэдна сутыкаецца з тэатральным жыццём, час-ад-часу выступаючы ў спектаклях (пушкінскі гурток, у якім прымаў удзел К. С. Станіслаўскі).

У 1887 годзе Марыя Міхайлаўна дэбютыруе на сцэне прафесіянальнага тэатра «Скамарох». Дэбют прайшоў бліскуча, і Марыя Міхайлаўна была залічана ў трупу. Два сезоны працуе яна ў «Скамароху», але яго рэпертуар, які складаўся з меладрам і вадэвіляў, не задавальняе маладую артыстку, і яна выязджае ў правінцыю.

Мільгаюць гарады — Тіфліс, Владзімір, Харкаў, Владзікаўказ, Одэса, Вільно, Растоў-на-Дану, Озеркі...

У Растове-на-Дану Марыя Міхайлаўна сустракаецца з рэжысёрам Н. Н. Сінельнікавым, і годы, праведзеныя ёю ў растоўскім тэатры, з'яўляюцца для маладой артысткі першай яе тэатральнай школай.

У 1901 годзе Сінельнікава запрашаюць у Маскву, у тэатр Корша, мастацкім кіраўніком Ён папаўняе трупу радам маладых таленавітых правінцыяльных актораў, запрашаючы ў іх ліку Марыю Міхайлаўну.

У тэатры Корша Марыя Міхайлаўна працуе беспераппынна да 1915 года, з 1915 па 1922 год яна ў Маскоўскім драматычным тэатры, затым—зноў у тэатры Корша. У 1933 годзе М М Блюменталь-Тамарына пераходзіць на работу ў Малы тэатр ..

Марыя Міхайлаўна перайграла сотні роляў. Яна стварыла здзіўляючыя па ўнутранай пераканальнасці, па яркай праўдзе вобразы ў п'есах лепшых драматургаў свайго народа: Уліта («Лес»), Анфуса Ціханаўна («Ваўкі і авечкі»), Домна Панцелееўна («Таленты і паклоннікі»), Тарцова («Беднасць не загана»), Пашлёпкіна («Рэвізор»). Ды ці можна пералічыць усе ролі класічнага рэпертуару, для якіх Марыя Міхайлаўна знаходзіла непаўторныя фарбы на сваёй невычарпальнай творчай палітры.

Сапраўдная артыстка народа, яна стварала ў совецкім рэпертуары вобразы выдатных мацярэй — старой рабочай маці Матыльковай у «Славе», салдацкай маці ў «На беразе Невы».

Духоўная старасць не кранула Марыю Міхайлаўну. У тэатры ніхто не здзіўляўся, што 80-гадовая Марыя Міхайлаўна, раніцой прарэпетыраваўшы ролю Тугаухавай у «Горы ад ума», увечары іграла спектакль, каб на наступны дзень удзельнічаць у абмеркаванні новай п'есы. над якой пачынаў працаваць Малы тэатр. Ніхто не здзіўляўся, калі Марыя Міхайлаўна прасіла, каб ёй даручылі ў новай пастаноўцы не адну, а дзве ролі: «Я буду іх іграць папераменна».

М. М. Блюменталь-Тамарына была сталай удзельніцай усіх шэфскіх канцэртаў, на якіх яна пакарала сэрцы байцоў Чырвонай Арміі праніклівым выкананнем урыўкаў з роляў і чытаннем апавяданняў і вершаў.

Партыя і ўрад дастойна адзначылі яе заслугі. У 1925 годзе яна атрымлівае годнасць заслужанай артысткі рэспублікі. у 1928 годзе — народнай артысткі РСФСР, у 1936 годзе — народнай артысткі СССР, а ў 1937 годзе яе ўзнагароджваюць ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэнам Леніна.

Выдатная актрыса, вартая дачка сваёй радзімы, яна была палкай патрыёткай, сапраўднай непартыйнай бальшавічкай, самаадданым таварышам, чалавекам вялікага гарачага сэрца.

Вялік смутак Малага тэатра, які падзяляюць з намі ўсе работнікі совецкага мастацтва, увесь шматмільённы совецкі глядач. Але ў гэтым смутку ёсць уцяшэнне: жыццё Марыі Міхайлаўны, уся яе дзейнасць. уся яе выдатная творчасць застанецца для ўсіх нас узорам таго, як трэба жыць і працаваць у Совецкай краіне, як трэба будаваць і рухаць наперад тэатр соцыялістычнай радзімы.

По даручэнню калектыва Дзяржаўнага ордэна Леніна Акадэмічнага Малага тэатра
народныя артысты СССР:
М. М. КЛІМАЎ. П. М. САДОЎСКІ, В. Н. РЫЖОВА, А. А. АБЛАЧКІНА, В. Н. ПАШЭННАЯ, А. А. ОСТУЖЭЎ.
Заслужаны дзеяч мастацтва І. Я. СУДАКОЎ.
Дырэктар Дзярж. ордэна Леніна Акадэм. Малага тэатра А. Я. ШУМІЛІН.
Сакратар парткома В. А. КУДРАЎЧЫКАВА.

Н. Г. ПАМЯЛОЎСКІ

* * *

(ДА 75-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ)

* * *

17 КАСТРЫЧНІКА мінула 75 год з дня смерці пісьменніка-рэаліста і дэмакрата Нікалая Герасімавіча Памялоўскага.

Літаратурная дзейнасць Памялоўскага пачалася ў часы, калі царскі ўрад, пацярпеўшы паражэнне ў Крымскай кампаніі, знясілены і напалоханы паўстаннямі сялян, накіраванымі супроць сваіх памешчыкаў, быў вымушан у 1861 годзе адмяніць прыгоннае права

Але адмена прыгоннага права была толькі чарговым манеўрам царскага ўрада і не прыносіла з сабой ніякага палягчэння працоўным сялянам; памешчыкі па-ранейшаму выціскалі з сялян апошнія сокі. сялянства паўпарызавалася (апралетарвалася), уцякала ў гарады. дзе трапляла ў новую, не менш цяжкую, кабалу да фабрыканта.

Гэта быў перыяд росту дэмакратычных сіл напаўфеадальнай Расіі, перыяд росту арганізаванай рэволюцыйнай сілы — пролетарыята, перыяд імкнення працоўных мас скінуць ярмо памешчыцкага і капіталістычнага гнёту са сваёй шыі.

У гэты перыяд на старонках друку з'явіліся творы Н. Г. Памялоўскага. «Мяшчанскае шчасце», «Молатаў», «Нарысы бурсы».

Два першых рамана звязаны паміж сабой асобай героя Егора Іванавіча Молатава. Памялоўскі ў вобразе Молатава паказвае разумнага і развітага працаўніка без усякай прымесі саслоўных элементаў ці забабонаў Молатаў — чалавек, зусім адарваны ад усякай глебы, у яго — ні кала, ні двара, ні сваякоў, ні заступнікаў, зусім нічога няма, апрача разумнай галавы і двух дужых рук.

Раман «Мяшчанскае шчасце» прадстаўляе іменна першае суровае сутыкненне юнага Молатава з шарахатасцямі рэчаіснасці. Ён пазнае на практыцы дзве ісціны: па-першае, што ўчынкамі людзей кіруюць у агульнай складанасці не пачуцці, а інтарэсы, і, па-другое, што вельмі мяккі і любячы чалавек можа часам груба і бязлітасна наступіць нагой на жывое чалавечае цела, здольнае адчуваць самы палкі боль Доказам першай ісціны служыць яму памешчык Обросімаў і яго жонка, другую ён чэрпае ў сваіх адносінах да Ленечкі.

Аб вобразе Ленечкі Д. І. Пісараў у сваім артыкуле пісаў так: «...Памялоўскі абраў сабе і вырашыў зусім новую задачу. некранутую да яго ні адным з выдатных рускіх пісьменнікаў: ён узяў зусім звычайную дзяўчыну, такую, ад якой нават і ў будучым нічога нельга чакаць апрача тузіны тоўстамордых рэбят, і да гэтай працейшай з простых смяротных ён аднёсся з бяспрыкладнай ціхамірнасцю і пяшчотнасцю.. Я да гэтага часу не сустракаў пісьменніка, у якога было-б так багата самароднай гуманнасці, як у Памялоўскага...».



Памялоўскі праводзіць свайго героя— разначынца Молатава па шляху жыцця тагочасных плебеяў ва ўмовах акружаючага яго з усіх бакоў мяшчанства і абывальшчыны. Молатаў «знаходзіць сабе месца ў грамадстве», месца абываталя, афяраваўшага парывамі маладосці для «мяшчанскага шчасця»

Галоўнае ў гэтых двух раманах тое што Памялоўскі з'яўляецца тут выкрывальнікам мяшчанства з яго ідэалам сытага і спакойнага жыцця. Сатырычныя карціны жыцця чыноўніцтва з пратэкцыямі і хабарамі пастаўлены Памялоўскім у процілегласць працоўным слаям грамадства, народжаным соцыяльна-палітычнымі ўмовамі тагочаснай рэчаіснасці.

Найбольш выдатным творам Памялоўскага з'яўляецца своеасаблівы аўтабіяграфічны раман «Нарысы бурсы».

Аўтар сам вучыўся ў бурсе, дзе «навука» прыпадносілася ў выглядзе жорсткіх лупцаванняў, штодзённых расправаў і бессэнсоўнай «зубрежкі» Жыццё бурсакоў было напоўгалодным і катаржным.

Вельмі цікавыя зарысоўкі «вучобы» бурсакоў, напрыклад: «Прапусціць літару, пераставіць словы лічылася злачынствам. Вучні, седзячы за кнігамі, паўтаралі бясконца і бяссэнсна: «стыд і срам, стыд і срам, стыд і срам... потым, потым..., пасціглі, сцігдлі, сцігдлі... стыд і срам, потым пасцігдлі». Такая агіпецкая работа прадаўжалася да таго часу, пакуль навекі не ўмацоўваўся ў галаве вучня «стыд і срам».

А калі вучань правінаваціўся ў чым-небудзь, дык яго «ставілі каленямі на пакатай дошцы парты, на высоўнае рабро яе, прымушалі ў двух шубах воўчых рабіць да двухсот земных паклонаў, загадвалі трымаць ва ўзнятай руцэ, не апускаючы яе, цяжкі камень па поўгадзіны і больш.. шпарылі лінейкай па далоні, білі па шчоках, пасыпалі лупцавакае цела соллю».

Метадамі такога «выхавання» бурсакоў хацелі адгарадзіць ад уплываў «гибельных идей западного вольнодумства». Аднак, па вядомаму ўрыўку з «Нарысаў бурсы», які мы прыводзім ніжэй, відаць, што такое выхаванне моладзі прыводзіла якраз да адваротных рэзультатаў.

«Калі для іх (бурсакоў) надыходзіць час броджання ідэі... і пачынаецца ломка перакананняў, гэтыя людзі, сілаю сваёй дыялектыкі і пры дапамозе назіранняў над жыццём і прыродай. ірвуць сець супярэчнасцей і сумненняў, якія ахопліваюць іх душу, пачынаюць чытаць пісьменнікаў. напрыклад. Фейербаха, забароненая кніга якога ў перакладзе на рускую мову нават і прысвечана бурсакам Пасля гэтага яны становяцца глыбокімі атэістамі».

Памялоўскі паказаў бурсу, як установу, у якой апрача адсталасці, тупасці і забабонаў нічога няма, а «выхавацы» выведзены ім як тыпы ліцамераў, духоўных уродаў, ханжаў.

Зусім нездарма «Нарысы бурсы» падвергліся строгай царскай цэнзуры: яны былі палітычным памфлетам на ўсю царскую Расію. у зарысоўках сістэмы школьнага гнёту і бяспраўя можна было бачыць у той час сімвал усёй самадзяржаўна-прыгонніцкай сістэмы з яе свавольствам і дэспатызмам.

А. М. Горкі сярод іншых герояў Памялоўскага адзначаў Чэрэваніна. Чэрэванін — адшчапенец, які не мірыўся ні з тэорыяй росквіту Молатава, ні з кар'ерызмам прыслужнікаў пануючых класаў. Чэрэванін — носьбіт дэмакратычных настрояў, але ён не здольны быў стаць на шлях рэволюцыйнай барацьбы. Аляксей Максімавіч Горкі піша, што «Герой Памялоўскага Чэрэванін, «нігіліст», народжаны ў адзін год з Базаравым Тургенева, але значна больш «дасканалы» нігіліст, чымсьці Базараў».

У нясконачаным рамане Памялоўскага «Брат і сястра» намаляван вобраз Пацесіна—«плебея» па выхаванню, плебея-змагара за народную справу.

Памялоўскі матывіраваў ідэю гэтага рамана так: «У нас ёсць велізарны слой грамадства, цэлая маса людзей, якая жыве асаблівым, мала вядомым для так званага адукаванага грамадства жыццём, — гэта бедны разрад разначынцаў. Людзі яны ці не? Дазнаемся-ж, што гэта за істоты, і выкрыем гнойную язву нашага — так, нашага грамадства».

Пісьменніцкая дзейнасць Памялоўскага прадаўжалася каля чатырох год. Цяжкі алкагалізм, да якога яго прывучыла бурса, перарваў жыццё пісьменніка на 29-м годзе жыцця.

Праўдзівы дэмакратычны рэалізм і мэтанакіраванасць Памялоўскага выказаны ў словах яго героя Чэрэваніна: «Ці ведаеш, што значыць чэсна мысліць, не баяцца сваёй галавы, свайго розуму, глядзець у сваю душу, не падлічаючы, а калі не верыш чаму, дык і гаварыць, што не верыш, не абдурваць сябе? О, гэта цяжкая справа! Хто ашуквае сябе, той заўсёды спакойны; але я не хачу вашага спакою».

Мільёны совецкіх чытачоў любяць і цэняць творчасць пісьменніка дэмакрата Нікалая Герасімавіча Памялоўскага

Д. ОСІН.

ВЫСТАЎКА НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

Днямі адбылося пасяджэнне камісіі па адбору экспанатаў для другой усебеларускай выстаўкі народнай творчасці, якая прысвячаецца XXI гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі і XX-годдзю ленінска - сталінскага комсамола. У камісію ўвайшлі скульптар Керзін, мастакі Малкін, Зайцаў, Кроль, Манасзон, прадстаўнік Акадэміі навук БССР Сербаў і прадстаўнікі Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР тт. Рубенчык і Андруховіч.

Камісія азнаёмілася з 450 экспанатамі народнай творчасці, з якіх 250 прадстаўляюць ткацтва і вышыванне, астатнія — жывапіс, акварэль, скульптуру, разьбу па дрэву і інш. Пераважная большасць экспанатаў ухвалена і прынята для выстаўкі.

Асаблівае захапленне членаў камісіі выклікалі шматлікія ўзоры ткацтва і вышыўкі калгасніцы Уздзенскага раёна Марыны Ліпай. Амаль усе яе работы на сучасную тэматыку выкананы з вялікім мастацкім густам і аздоблены сапраўды народным беларускім арнаментам. Вельмі цікавыя работы прадставілі таксама ткачыхі Ульяна Лясніцкая, Н. Чэркас, Семашка, Палішчук, вышывальшчыцы Гофмейстар, Арбузава, Самусенка і інш. Усе экспанаты гэтых майстроў адзначаюцца прыгожым беларускім арнаментам, багаццем фарбаў і сведчаць аб вялікім мастацкім гусце іх тварцоў.

Трэба адзначыць, што 250 экспанатаў ткацтва і вышыўкі прадстаўлены толькі калгасніцамі чатырох раёнаў — Капыльскага, Чырвонаслабодскага, Слуцкага і Уздзенскага. З іншых раёнаў экспанаты яшчэ прыбываюць.

Апрача экспанатаў рукадзелля камісія адабрала для выстаўкі рад мастацкіх твораў самадзейных мастакоў, скульптараў, рэзчыкаў па дрэву і інш. Вялікай увагі заслугоўваюць работы маладога скульптара Паварыча (бюст Леніна), жывапісцаў Церахава (карціна «Спайманне дыверсанта»), чырвонаармейца Зайцава («Артылерысты ў паходзе»), Мацука («Узрыў маста», «Разгром белапалякаў»), Дамінскага («Чырвоны абоз», «Зварот таварыша Сталіна з ссылкі»), рэзчыкаў па дрэву Шэвіча («Ленін і Сталін у Горках»), чырвонаармейца Івінскага (барэльеф «Артылерысты») і інш. Арыгінальную работу — вышыўку «Пагранічнік» — прадставіў чырвонаармеец Цубрыкаў. Вышыўка вызначаецца яркасцю штрыха і экспрэсіяй.

Другая ўсебеларуская выстаўка будзе, бяспрэчна, вельмі цікавай і адлюструе новы ўздым народнай творчасці.

П.

У ДАПАМОГУ НАСТАЎНІКУ

ПЕРШЫЯ ПОМНІКІ НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

(„ЭНЕІДА НАВЫВАРАТ“ І „ТАРАС НА ПАРНАСЕ“)

Міх. ЛАРЧАНКА

У канцы XVIII і ў пачатку XIX стагоддзя пачынае развівацца новая беларуская літаратура на жывой народнай мове. Першымі помнікамі гэтай пісьмовай літаратуры з'яўляюцца паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», узнікнуўшыя пад непасрэдным уплывам рускай і украінскай літаратуры. Па свайму жанру гэтыя творы з'яўляюцца героіка-камічнымі паэмамі. Сам жанр героіка-камічнай паэмы мае даволі доўгую гісторыю і тоывалую літаратурную традыцыю. Узнік ён яшчэ ў старажытнай Грэцыі часоў Гамера і ў розныя гістарычныя эпохі набываў своеасаблівыя паэтычныя рысы. Мастацкая сутнасць героіка-камічнай паэмы заключаецца ў тым, што бярэцца які-небудзь гераічны эпічны твор альбо антычны міф, і паказваецца ў камічна-парадыйнай, жартоўнай форме, прычым персанажныя вобразы, узятыя з міфалогіі альбо гераічна-класічнага эпаса, зніжаюцца, г. зн. ставяцца ў звычайную бытавую абстаноўку народных «нізоў» (сялян, гарадскога мяшчанства, бурлакоў і інш.), а мова гэтых паэм і вобразаў заўсёды знаходзіцца ў рэзкім кантрасце з «высокай» тэмай паведамлення; яна палкам з'яўляецца народна-бытавой часта натуралістычна грубаватай. Гэты жанр атрымаў асабліва шырокае развіццё ў эпоху гандлёвага капітала і характарызаваў сабой зараджэнне буржуазна - дэмакратычнай літаратуры. У пачатку XVI стагоддзя італьянскім паэтам Людовіко Арыюста была створана паэма «Неистовый Роланд» якая з'яўлялася дасканальнейшым узорам героіка-камічнай паэмы.

Ва Францыі, у сярэдзіне XVII стагоддзя, Скарон, з'яўляючыся выразнікам буржуазнай дэмакратыі таго часу, напісаў парадычны твор на Віргіліеву «Энеіду», дзе ў форме парадыравання даў рэзкую крытыку тагочасных літаратурных густаў, востра высмеяў класіцызм, які арыентыраваўся на старажытную рымскую і грэчаскую літаратуру.

У другой палове XVII стагоддзя ў плане Скарона Віргіліеву «Энеіду» пераклаў на англійскую мову Катон.

У сярэдзіне XVIII стагоддзя жанр парадыйнай героіка-камічнай паэмы адпаведным чынам выкарыстоўваўся і апрацоўваўся вялікім гуманістам і асветнікам Вольтэрам. Вольтэр, як прадстаўнік новых эстэтычных поглядаў і новай літаратуры, стварае вялікую паэму «Орлеанская девственница», дзе ў форме парадыравання «Девственницы» прыдворнага паэта Шаплена, у якой ідэалізавалася папоўская легенда аб Жанне-д'Арк, дае рэзкую сатыру на ўсю рэлігію і на тагочасныя літаратурныя густы.

Скарон і Вольтэр мелі пэўны ўплыў і на рускую літаратуру XVIII стагоддзя. У Расіі ў XVIII стагоддзі шырока распаўсюджваюцца розныя героіка-камічныя жанры, парадыйныя творы, у якіх рэзка высмейваецца класіцызм, літаратурныя густы дваранскай арыстакратыі, якая ў сваёй паэзіі наследавала ўзорам класічнай рымскай і грэчаскай літаратуры. Такімі творамі з'яўляюцца: «Игрок Ломбера», «Елисей или раздраженный Вакх» В. І. Майкава; «Стихи на качели», «Стихи на семик», «Плачевное падение стихотворцев» М. Д. Чулкова; «Виргилиева Энеида, вывороченная наизнанку» Н. П. Осіпава; «Окончание Виргилиевой Энеиды вывороченной наизнанку» Александра Кацельніцкага; «Ясон, похититель святого руна во вкусе нового Энея» Івана Наумава; «Похищение Прозерпины» Е. Люцэнка.

Усе гэтыя творы прасякнуты парадыйным высмейваннем перш за ўсё ложна-класічнай літаратуры і эстэтычных густаў дваранскай арыстакратыі, якая арыентыравалася на старажытную грэчаскую і рымскую літаратуру і антычную міфалогію.

Пад непасрэдным уплывам рускай героіка-камічнай паэмы і, у прыватнасці, «Виргилиевой Энеиды, вывороченной наизнанку» Н. Осіпава, узнікла украінская «Энеіда» Катляроўскага, а пасля і беларускія героіка-камічныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе».

Беларуская паэма «Энеіда навыварат» напісана невядомым аўтарам. Яна доўгі час была ненадрукаванай і распаўсюджвалася ў спісах і ў вуснай перадачы, ад чаго зрабілася напоўнародным творам. Некаторыя даследчыкі лічылі, што гэта паэма з'явілася ў 90-х гг. XVIII стагоддзя, але гэта не так. Калі выходзіць з тэкста самога твора, дзе ў кожным спісу ёсць канкрэтныя спасылкі на Кутузава і Банапарта, дык можна больш-менш дакладна ўстанавіць, што беларуская «Энеіда навыварат» не магла з'явіцца раней 1812 года, бо аўтар гэтай паэмы, прыводзячы параўнанне «Дамоўкі сталі ўбірацца як ад Кутузава Ліпарт» (а ў спісу 1851 года: «Кутузава Банапарт»), ужо ведаў пра вайну з Напалеонам 1812 года і пра вялікага палкаводца Кутузава.

У друк паэма трапіла толькі часткова, адным урыўкам, які складаецца з 300 радкоў. Адзін урывак гэтай паэмы быў надрукаван у журнале «Маяк» (1845 год), а другі — толькі ў канцы XIX стагоддзя ў «Смоленском Вестнике» (1890 год). Беларускую «Энеіду» сталі запісваць багата пазней пасля яе з'яўлення.

Як украінская «Энеіда» Катляроўскага не з'яўляецца перакладам «Энеиды» Н. Осіпава, хоць і напісана пад яе непасрэдным уплывам, так і беларуская «Энеіда навыварат», не гледзячы на некаторае падабенства, не з'яўляецца перакладам з украінскай альбо рускай мовы. Яна ёсць арыгінальны і своеасаблівы твор, які мае гістарычнае і мастацкае значэнне ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя.

Цесная сувязь беларускай «Энеіды навыварат» з рускай «Энеидай» Осіпава і украінскай Катляроўскага толькі сведчыць аб неразрыўнай сувязі культуры і літаратуры трох вялікіх славянскіх народаў, звязаных векавымі узамі дружбы.

Сюжэт беларускай «Энеіды навыварат» у тым урыўку паэмы, які захоўваецца ў рукапісах і ў друку, амаль паўтарае сюжэт рускай і украінскай «Энеіды», дзе парадыруецца «Энеіда» рымскага паэта Віргілія, што жыў у першым стагоддзі да нашай эры. Разгортваецца сюжэт у наступным плане. Эней, дзяцюк рухавы, пасля таго, як грэкі ўзялі Трою, зрабіўшы човен, узяў з сабой траянцаў і паплыў з імі па моры. Юнона, «баба злая, атроддзя панскага ліхая», убачыўшы Энея, якога яна ненавідзела за тое, што ён быў сынам Венеры, захацела перашкодзіць яго вандраванню. Яна «панёву шпарка нахапіла», пайшла да свайго свата Эола, бога вятроў, прасіць, каб ён знішчыў Энея і яго спадарожнікаў-траянцаў.

За гэту паслугу Юнона абяцае Эолу «дзявуху украсіву, салодкую, як з мёдам сліву». Эол, выконваючы просьбу Юноны, склікае сваіх вятроў — Барэя, Норда, Эўра і загадвае ім, каб яны бурлілі мора. Эней і траянцы апынуліся ў цяжкім становішчы. Каб дапамагчы справе выратавання, Эней упрашвае бацьку Нептуна, бога марэй, каб ён супакоіў мора, абяцаючы за гэта добра заплаціць яму грашыма. Маючы ахвоту да грошай, Нептун задавольвае просьбу Энея. Ён пачынае крычаць на вятроў і праганяе іх з падуладных яму прастораў. Мора супакоілася. Узышло сонца. Эней з траянцамі наладжвае абед. Паабедаўшы, яны заснулі. Венера, якая вярнулася з кірмаша, неяк дачулася аб няшчасці свайго сына. Яна спяшаецца дапамагчы Энею ў яго хутчэйшым ратунку. Для гэтай мэты Венера ідзе да Зеўса, цара багоў, і расказвае яму аб няшчасці, спаткаўшым Энея, просіць дапамогі. Зеўс запэўняе Венеру, што вандраванне яе сына скончыцца шчасліва, што ён даедзе да Рыма і будзе там царом. Падзякаваўшы Зеўсу за такое абяцанне, Венера пайшла ад яго.

Эней у гэты час сабраўся і са сваімі траянцамі паплыў далей па моры. Пасля доўгага вандравання яны прыплываюць на бераг да горада Карфагена (у паэме Карфагені), дзе іх спаткала царыца гэтага горада Дзідона, якая спачатку нявётліва прыняла Энея і яго спадарожнікаў. Яна стала крычаць на іх, называючы траянцаў абарванцамі, цыганамі, злодзеямі. Калі траянцы паказалі перад Дзідонай сваю дабрату, падрабязна расказалі аб сабе, што яны вельмі працавітыя людзі, але трапілі ў вялікае гора, то царыца аж заплакала і, зжаліўшыся над імі, запрасіла ўсіх да сябе і паладзіла ім частаванне. Эней і траянцы паселі за стол, пачалі піць, закусваць рознымі стравамі. Добра выпіўшы і закусіўшы, яны пачынаюць гулянне, музыкі, скокі. На гэтым і заканчваецца захаваўшыйся ўрывак беларускай «Энеіды навыварат».

У персанажных вобразах міфалагічных багоў, якія ўзяты з рымскай і грэчаскай міфалогіі і дзейнічаюць у «Энеідзе навыварат», апрача чыста літаратурнай пародыі на псеўда-класічную літаратуру, мы маем сатырычнае высмейванне арыстакратычнага дваранства і памешчыкаў - прыгоннікаў. Для таго, каб сатырычна высмеяць арыстакратаў-прыгоннікаў, паказаць іх нікчэмнасць і нягоднасць, невядомы аўтар паэмы ставіць сваіх герояў-багоў у звычайнае соцыяльнае асяроддзе, у сялянскую бытавую абстаноўку і ў шаржыравана-грatэскавым плане, шляхам давядзення асобных рыс і бытавых момантаў да крайнасці, дасягае вялікай мастацкай сатырычнай жывасці ў абмалёўцы персанажных вобразаў.

Так, Юнона, якая згодна рымскай міфалогіі з'яўляецца багіняй неба і пакравіцельніцай шлюбу, рысуецца ў паэме як «баба злая, атроддзя панскага ліхая». Яна «неўзлюбіла» Энея за тое, што ён сын Венеры. Калі Юнона ўбачыла з неба, што «плывець на чаўнаку Эней», яна пачала лаяцца, крычаць на Энея («ах ты, някрушіха, зладзей, вось я цябе скручу ў табаку, ражном у мора як сабаку»), зараз-жа сабралася ехаць прасіць бога вятроў Эола, каб ён дапамог знішчыць Энея.

Эол, які сядзеў «тады на печы», злез і, пакланіўшыся Юноне, «мякотнага на стол падаў». І далей Юнона рысуецца звычайна сварлівай, злоснай бабай, прыгонніцай, якая за паслугі абяцае Эолу дзяўчыну.

Вобраз Эола, бога вятроў, у нашай паэме парадыруецца ў такім плане, што ён, апрача чыста літаратурнай пародыі, мае і пэўнае соцыяльнае аблічча, якое нагадвае асобнымі рысамі арыстакрата альбо памешчыка-прыгонніка, бо тут успамінаецца паншчына, прыгон, батракі, што гавораць аб характары памешчыка-прыгонніка.

Нептун, згодна рымскай міфалогіі, бог марэй (у грэкаў Пасейдон), рысуецца ў нашай паэме як прадажны хабарнік і п'яніца, які, пачуўшы, што Эней абяцае яму багата грошай, згадзіўся дапамагчы Энею і праганяе сваіх вятроў з мора.

А міфалагічны вобраз Венеры, багіні кахання і харaства, рысуецца ў паэме выключна ў плане грубага гратэска і шаржа.

Пры дапамозе грубага шаржыравання і выкарыстання вульгарызмаў у абмалёўцы багіні харaства і кахання, якая ў дваранскай літаратуры з'яўлялася сімвалам надзвычайнай прыгажосці, у нашай паэме парадыруюцца эстэтычныя густы дваран-памешчыкаў і псеўда-класічнай літаратуры.

Вельмі вострым з'яўляецца ў паэме парадыраванне Зеўса, які згодна грэчаскай міфалогіі ёсць цар багоў і людзей. Гэты бог-п'яніца пастаўлен аўтарам у надзвычай камічнае становішча. У гэтым становішчы ён робіцца вельмі мізэрным і нікчэмным, выклікаючы гэтым самым у чытача смех і знявагу.

Дзідона, царыца Карфагена, з якой спаткаліся траянцы, прыплыўшы да яе горада, паказваецца ў гумарыстычным плане, як тыповая распусная прыгонніца, якая свайго «дзесяцкага прыбіла», а спаткаўшы бедных абадраных траянцаў, якія просяць, каб яна запісала іх у сваю крэпасць, і выслухаўшы іх вялікае гора, спачатку «румзала і выла, цякло як з лівера з вачэй, маністы дзёргала, круціла, а сэрца тых-тых-тых у ей», а потым, падумаўшы, што Эней як мужчына ёй спатрэбіцца, сказала:

Калі-б Эней ваш схамянуўся,
Ды сам ка мне-бы падвярнуўся,
Усячыны-б тады дастаў.

Сярод вобразаў міфалагічных багоў, у якіх рысуецца ў парадыйнай форме арыстакратыя і высмейваецца ложна-класічная літаратура, асобнае месца ў паэме займаюць па сваёй ідэйнай накіраванасці вобраз Энея і вобразы траянцаў. Эней і траянцы абрысоўваюцца ў паэме не заўсёды ў парадыйным плане і ў ідэйных адносінах яны супроцьлеглы міфалагічным багам (а ў рэальным плане — панам).

Да Энея аўтар адносіцца з некаторым спачуваннем і сімпатыяй, рысуючы яго не як грубіяна і самадура пана-прыгонніка, а як перадавога чалавека з дваранскага асяроддзя, які зблізжаецца з сялянскай масай і імкнецца стаць яе важаком.

Вобраз Энея па сваёй абрысоўцы падобен да вобраза Фурмана Елісея з паэмы Майкава «Елисей или раздраженный Вакх». У вобразе Энея таксама выведзен чалавек ужо не з арыстакратычнага асяроддзя, а з сярэдняга саслоўя. Гэтым самым паэма па сваіх эстэтычных і паэтычных правілах супроцьстаўляецца ложна-класічнай літаратуры, у якой не дазвалялася выводзіць людзей з сярэдняга саслоўя.

У будучым Эней малюецца як дзейсны рэфарматар, які выступіць супроць паноў-прыгоннікаў («падпусціць фігля самай пані»), адставіць іх на задні план і зробіць усё па-новаму.

Яшчэ больш ярчэй праяўляецца дэмакратызм і народнасць паэмы ў абрысоўцы вобразаў траянцаў. Вобраз траянцаў — гэта вобраз народных мас беларускага сялянства ў часе прыгонніцкага ладу. Зарысоўваючы ў саркастычнай форме ў вобразе міфалагічных багоў паноў - прыгоннікаў, аўтар спачувальна адносіцца да прыгнечанай масы народа і ў вобразе траянцаў рэалістычна паказвае яго страшэнную беднасць і жабрацкае становішча.

Нават у пакорлівай просьбе траянцаў да Дзідоны даецца праўдзівая карціна жыцця беларускага народа, дзе паказваюцца рысы працаздольнасці працоўнага беларускага селяніна.

Паказваючы праўдзівыя карціны жыцця беларускага народа ў часы прыгонніцкага ладу, аўтар рысуе іх так, каб высмеяць паноў-прыгоннікаў і іх літаратурныя густы. А каб сатырычна высмеяць паноў, паказаць іх нікчэмнасць, каб парадыраваць ложна-класічнае ўяўленне аб літаратуры, для гэтай мэты бярэцца вобразы міфалагічных багоў і ставяцца ў рэальную бытавую абстаноўку жыцця беларускага сялянства, такім чынам парадыруюцца, высмейваюцца. Само па сабе ўвядзенне ў паэму траянцаў паказвае на тое, што паэма прасякнута дэмакратызмам. Паэма супроцьстаўляецца ложна-класічнай літаратуры, якая забараняла ўводзіць у літаратурны твор народныя масы.

Жыццё беларускага народа паказваецца ў паэме выключна ў сялянска-бытавых момантах. Паэма знаёміць нас з характэрнымі прыналежнасцямі беларускай сялянскай вопраткі (андарак, панёва, аборы, лапці, анучкі рабыя, кашэль, пояс і інш.) і са стравамі, якія ўжываліся сялянствам (крупеня, кулага, сачні, парасяціна смажаная і інш.).

Наогул, аўтар паэмы паказвае ўвесь бытавы ўклад беларускага селяніна старых часоў, выкарыстоўваючы гэты бытавы ўклад для сатырычнага парадыравання міфалагічных багоў.

Так, апрача тых момантаў, калі багі зусім на вясковы манер «сцябаюць гарэлку з мёдам», «ляжаць на печы», «зажымаюць у паздру табаку», у канцы паэмы даецца мастацкая карціна вясёлай гулянкі, дзе асабліва рэльефна выступае бытавы момант жыцця беларускага сялянства.

Паэма «Энеіда навыварат», апрача чыста літаратурнай пародыі на ложна-класічнае мастацтва, з'яўляецца яшчэ і антыпрыгонніцкім, дэмакратычным творам. Аб гэтым сведчаць і ўсе моўна-мастацкія сродкі паэмы. Уся паэма напісана ў казачна - фальклорным плане. У характарыстыцы вобразаў і карцін жыцця беларускага народа выкарыстана народная мова, такія, напрыклад, вобразныя звароты, прыёмы народнай стылістыкі, як «вось я цябе скручу ў табаку», «ражном у мора як сабаку», «са страху нюні распусціў, ды як у лесе ён завыў», «глядзі, скашгуеце дубіны, і ноздры вам ражном утруць»; «з траянцаў выцісну алею» і інш.

У асобных месцах паэмы выкарыстоўваецца мова і выразы з пэўным ухілам у шарж і натуралізм для таго, каб больш акрэслена адцяніць тую альбо іншую рысу ў абрысоўцы герояў. Напрыклад: «матуз ад портак аж зваліўся»; «з яго аж слінка пацякла»; «траянцы ўсе казлы задралі»; «саплямі змазана ўсё рыла» і інш. Таксама ў паэме выкарыстана народная лексіка і асобныя дыялектызмы («кацатых» — лапцевае шыла), «патрыгі», «варыгі» (назолы), «кавярзні» — лапці, «абмішуліўся», «дапрэць», «сцябаў гарэлку» і інш.), пры дапамозе якіх узмацняецца мастацкасць парадыйнай характарыстыкі асобных людзей і вобразаў.

У паэме сустракаюцца разгорнутыя параўнанні, якія пабудаваны па фальклорнаму прынцыпу: проста, на непасрэднай канкрэтнай аснове.

Агульны вывад, які вынікае з аналізу паэмы «Энеіда навыварат», зводзіцца да наступнага: героіка - камічная паэма, як літаратурная пародыя на ложна-класічную літаратуру дваранства і як антыпрыгонніцкі дэмакратычны твор, прасякнуты народным гумарам і сатырай, у якім шляхам парадыравання высмеяны паны-прыгоннікі і дваранская літаратура, дадзены праўдзівыя карціны жыцця беларускага народа ў часы прыгонніцкага ладу, — з'яўляецца вельмі каштоўным творам у развіцці беларускай літаратуры пачатку XIX стагоддзя. Гэтым самым паэма мае вялікае гістарычнае, літаратурнае і аб'ектыўна - пазнавальнае значэнне, як першы помнік новай беларускай літаратуры, створаны ва ўмовах цеснага яднання беларускага народа з рускім і украінскім народамі і іх культурай, аказаўшай плённы ўплыў на развіццё нашай літаратуры.

«Тарас на Парнасе» таксама, як і «Энеіда навыварат», з'яўляецца арыгінальнай беларускай героіка-камічнай паэмай, напісанай на жывой народнай мове невядомым аўтарам. Напісана гэта паэма, трэба думаць, пасля «Энеіды навыварат» і другім аўтарам, таму што на ёй заўважаны пэўныя ўплывы першай і, апрача таго, яна ў фармальна-мастацкіх адносінах з'яўляецца больш дасканалай і больш таленавітай.

Грунтуючыся на тэксце паэмы «Тарас на Парнасе», можна дакладна сказаць, што яна не магла быць напісана раней 1836 года. Аб гэтым сведчаць не толькі некаторыя дэталі ў тэксце паэмы (успаміны аб рэакцыйным пісьменніку Фадзею Булгарыну і яго выступленнях супроць Гогаля, якія мелі месца ў газеце «Северная пчела» ў 1836 і ў 1842 годзе), але і ўся яе ідэалагічная накіраванасць, дзе адчуваецца пульс літаратурнай барацьбы 30—40-х гг. XIX стагоддзя, шчырая сімпатыя нашага аўтара да Пушкіна і Гогаля і рэзка сатырычны паказ іхных антаганістаў, рэакцыянераў Булгарына і Грэча.

У сувязі з тым, што ў паэме не ўспамінаецца смерць Пушкіна, можна лічыць, што паэма была напісана менавіта ў 1836 годзе, а не пазней, бо аўтар, спачуваючы Пушкіну, абавязкова адгукнуўся-б на смерць Пушкіна.

Надрукавана была паэма «Тарас на Парнасе» толькі ў канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя («Минский листок» № 37, 1889)*). Да гэтага часу паэма жыла толькі ў вуснай перадачы народа і ў асобных запісах аматараў паэзіі. Яна была вельмі папулярным творам сярод беларускіх народных мас; многія ведалі ўсю паэму напамяць. Усё гэта разам узятае сведчыць аб народнасці і высокай мастацкасці твора.

Па сваёй ідэйнай накіраванасці паэма «Тарас на Парнасе» цалкам далучаецца да «Энеіды навыварат», як пародыя на псеўда-класічную літаратуру і як дэмакратычны антыпрыгонніцкі, рэалістычна - парадыйны твор. Больш таго, гэта паэма, грунтуючыся на паэтычных дасягненнях рускай літаратуры, больш паглыбляе дэмакратызм і народнасць «Энеіды навыварат» і ўзнімае паэтычную культуру беларускай паэзіі таго часу на вышэйшую ступень.

Сюжэт паэмы «Тарас на Парнасе» з'яўляецца арыгінальным і самабытным. Па свайму кампазіцыйнаму афармленню і разгортванню сюжэта паэма «Тарас на Парнасе» ўяўляе сабой зграбна пабудаванае гумарыстычна-сатырычнае апавяданне аб тым, як беларускі селянін Тарас, служыўшы ў пана палясоўшчыкам, аднойчы, робячы свой звычайны абход лесу, выпадкова трапіў на міфалагічную гару Парнас, дзе жывуць толькі багі. Павандраваўшы па гэтай гары, Тарас вяртаецца зноў у свой лес, адкуль ён прышоў. Усё паведамленне разгортваецца ў сказавай форме, г. зн. аўтар апавядае аб падзеях вуснамі свайго галоўнага героя Тараса. Усе дзеянне і падзеі паэмы скандэнтраваны вакол асноўнага персанажнага вобраза. У гэтым нескладаным разгортванні сюжэта і ў самім кампазіцыйным афармленні паэмы выяўляецца высокае паэтычнае майстэрства аўтара будаваць паэтычны твор. Тут мы маем надзвычайную сканцэнтраванасць, сцісласць дзеяння і кампазіцыі. Дзеянне адбываецца зусім у невялікі прамежак часу — ад ранку да вечара. А між тым у гэты невялікі момант паэт змог уласцiць паказ жыцця беларускага народа цэлай эпохі і разам з тым змог паказаць класавы фронт рускай літаратуры 30—40-х гг. XIX стагоддзя, сатырычна зарысаваць рэакцыянераў Булгарына і Грэча, якія вялі барацьбу супроць вялікіх рускіх пісьменнікаў Пушкіна і Гогаля. Разам з гэтым аўтар паказаў сваё сімпатыі, любоў і павагу менавіта да гэтых вялікіх пісьменнікаў. Усё гэта ў паэме зроблена надзвычайна трапна і па-мастацку.

Дзеянне паэмы сканцэнтравана вакол асноўнага вобраза — селяніна Тараса. У абрысоўцы вобраза Тараса ўвасоблены асобныя рысы беларускага працоўнага селяніна. Гэтымі рысамі з'яўляюцца: любоў да працы, чэснасць, шчырасць, дабрата, смеласць, цвярозасць, дасціпнасць, здаровы смех і мудры гумар. Усе гэтыя рысы ў паэме прыпісваюцца Тарасу. У супроцьлегласць п'янству і маральнаму разлажэнню багоў-паноў, Тарас рысуецца чалавекам «рахманым», добрасумленным, чэсным, працавітым, смелым, спрытным, маральна-здаровым, які выклікае павагу і пашану да сябе нават з боку багоў-паноў.

Аўтар ненавідзеў гэтых паноў і вуснамі Тараса саркастычна высмейваючы іх, гаворыць аб тым, што яны як свяры:

Гатоў адзін другога з'есці.
Бо кожны морду ўпярод суе,
Каб першым на гару ўалезці.

У гэтых радках праўдзіва адлюстроўваецца палітычная і маральная сутнасць прыгонніцкага, а разам з гэтым і буржуазнага грамадства, дзе чалавек чалавеку воўк. Да гэтага бесчалавечнага грамадства і яго пануючага класа — памешчыкаў-паноў — аўтар паэмы, як і яго герой Тарас, адносіцца адмоўна.

Даўшы сатырычныя замалёўкі рэакцыйных літаратараў — праважатара Булгарына і яго таварыша Грэча, якія лезуць на Парнас, аўтар паэмы высмейвае, такім чынам, рэакцыйную дваранскую літаратуру і разам з тым з вялікай павагай і пашанай адносіцца да рускай літаратуры ў асобе яе выдатнейшых прадстаўнікоў: Пушкіна, Лермантава, Гогаля і Жукоўскага.

Гэтыя рэалістычныя зарысоўкі рускай літаратурнай рэчаіснасці сведчаць аб глыбокім дэмакратызме беларускай паэмы і яе арганічнай сувязі з крытычным рэалізмам Пушкіна і Гогаля.

Паэма «Тарас на Парнасе» ў адносінах абрысоўкі міфалагічных багоў наследуе «Энеідзе навыварат»; у ёй мы таксама маем імёны багоў з грэчаскай і рымскай міфалогіі, якія з мэтай парадыйнага высмейвання ставяцца ў звычайную гаспадарча-бытавую абстаноўку жыцця беларускага сялянства таго часу. Сялянскі быт, у асяроддзе якога ставяцца багі, з'яўляецца ў паэме мастацкім прыёмам парадыравання, гумарыстычнага і сатырычнага высмейвання псеўда-класічнай літаратуры з яе міфалагічнымі вобразамі і яе адрывам ад рэчаіснасці.

Каб паказаць, што аўтар паэмы ў вобразе міфалагічных багоў апрача чыста літаратурнага высмейвання мае яшчэ на ўвазе крытыку паноў-арыстакратаў, ён у пачатку адзначае, што на Парнасе стаіць «панскі двор», абгароджаны ад злодзеяў яловым тынам. Тут-жа парнаскія хлопцы-дзяцюкі гуляюць у карты і хто капейкі з іх не мае, «той лупіць проста на шчаўчкі». Калі Тарас зайшоў да гэтых багоў у хату, то ён убачыў дзіўнае жыццё багоў, якія жывуць зусім на сялянскі манер.

Цікавым з'яўляецца само па сабе парадыраванне міфалагічных багоў у той момант, калі яны пачынаюць абедаць. Тут рэальна-бытавая карціна сялянскага жыцця выкарыстана не толькі як форма парадыравання «міфалагічнага неба» і яго жыхароў, але і як момант паказу народнага жыцця ў яго бытавых замалёўках.

Вакх, бог віна і п'янства, спявае брыдкія прыпеўкі; Марс, бог вайны, «у новых ботах з німфамі скакаў да поту, туляў у жмуркі і шалеў»; а Юпітэр, цар багоў з багіняй плоднасці Вестай, пусціўся «стары хрэн у пляс, як-бы жаніх перад нявестай, заткнуў ён рукі за пояс».

Такім чынам у гэтых рэальна-бытавых карцінах сялянскага жыцця, дадзеных канкрэтна і каларытна, сатырычна высмейваюцца, парадыруюцца міфалагічныя багі, а разам з гэтым і ўся дваранская ложна-класічная літаратура, якая карысталася грэчаскай і рымскай міфалогіяй і з'яўлялася надзвычайна далёкай ад сапраўднага жыцця.

Тарас, як вобраз працоўнага беларускага селяніна, і ў гэтых рэальна-парадыйных карцінах сялянскага быту супроцьстаўляецца разбэшчанай разгульнасці і п'янству, міфалагічных багоў, і ў сваёй весялосці і скоках ён інакш весяліцца і так па-свойму лоўка танцуе, што яму зайздросцяць багі.

З папярэдняга аналізу сюжэта, кампазіцыі, персанажных вобразаў і рэальна-бытавых зарысовак з жыцця беларускага сялянства можна бачыць, што паэма «Тарас на Парнасе» па свайму слоўна-паэтычнаму майстэрству і культуры верша стаіць значна вышэй за «Энеіду навыварат». Мова паэмы «Тарас на Парнасе» з'яўляецца больш народнай, больш сакавітай, больш апрацаванай, больш простай і зразумелай; уся паэма напісана на чыста народнай тагочаснай беларускай мове, амаль без правінцыялізмаў, незразумелых слоў і паланізмаў. У гэтых адносінах паэма «Тарас на Парнасе» мае вялікае значэнне і ў развіцці беларускай мовы. Лексіка і стылістычнае афармленне паэмы прасякнуты народнай прастатой і сакавітасцю. Вершаваны рытм паэмы «Тарас на Парнасе», пабудаваны на аснове чатырохстопнага ямба, з'яўляецца больш лёгкім, гібкім і меладычным, чым у «Энеідзе навыварат». Чатырохрадковыя строфы паэмы з перакрэснай мужчынскай і жаночай рыфмай па-фальклорнаму простыя, надзвычай мілагучныя: яны нагадваюць сабой частушкі, якія па-майстэрску адшліфаваны. Усё гэта робіць паэму мастацкім і цікавым творам.

Па сваёй паэтычнай прастаце, па лёгкасці і гібкасці рытму, яснасці і зразумеласці слоўна-вобразных сродкаў, зграбнасці сюжэта і кампазіцыі героіка-камічная паэма «Тарас на Парнасе», як пародыя на дваранскую ложна-класічную літаратуру, буйную арыстакратыю і яе эстэтыку, як народная і дэмакратычная паэма, што цесна прымыкае па сваёй ідэйнай накіраванасці і паэтычнаму майстэрству да вялікай рускай літаратуры, стваральнікам якой быў А. С. Пушкін,—займае першае месца ў беларускай літаратуры першай паловы XIX стагоддзя і мае вялікае мастацка-пазнавальнае і гістарычнае значэнне.


*) Пасля паэма была надрукавана ў «Смоленском Вестнике» № 37 у 1890 г.; асобнымі выданнямі: «Тарас на Парнасе», беларуская паэма, Віцебск — 1896 г., Гродно — 1899 г.; у кнізе К. Раманава: «Тарас на Парнасе» і іншыя беларускія вершы — 1900 г. Апрача гэтага, паэма выйшла асобнай кніжкай у выданні «Нашай хаты», 1890 г.



Па гарадах Савецкага Саюза.
Палац урада Грузінскай ССР у Тбілісі. Фота С. Будзешскага (СФ).



Да пуску Горкаўскага радыуса метрапалітэна імя Л. М. Кагановіча.
Знадворны выгляд надземнага вестыбюля станцыі «Дынамо». (СФ).



«ЦАРСКАЯ НЯВЕСТА» У ДЗЯРЖАУНЫМ БЕЛАРУСКІМ ТЭАТРЫ ОПЕРЫ І БАЛЕТА. НА ЗДЫМКУ: Сцэна з 4-й дзеі оперы.

Фота Грына.

НОВЫЯ КАЛЕКТЫВЫ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Падрыхтоўка да трэцяй усебеларускай алімпіяды мастацкай самадзейнасці, прысвечанай XX гадавіне ленінска-сталінскага комсамола і XXI гадавіне Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі, выклікала новы ўздым актыўнасці шматлікай арміі ўдзельнікаў самадзейнасці. Вестка аб алімпіядзе хутка дайшла да самых аддалёных калгасаў, і яшчэ да таго, як з'явіліся прадстаўнікі раённых цэнтраў, у пераважнай большасці мастацкіх калектываў закіпела напружаная работа. Жаданне заваяваць пяршынства, атрымаць права ўдзелу ў абласной і ўсебеларускай алімпіядах такое вялікае, што многія самадзейныя калектывы арганізавалі **штодзённыя** рэпетыцыі свайго рэпертуару.

На многіх прадпрыемствах, у многіх калгасах былі створаны новыя мастацкія гурткі. Існуючыя калектывы папоўнены новымі ўдзельнікамі. Падрыхтоўка да алімпіяды ўцягнула **новыя тысячы** ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, жадаючых аддаць свой вольны час на карысную і цікавую справу.

Так, клуб віцебскай фабрыкі імя Клары Цэткін уцягнуў у мастацкую самадзейнасць каля двухсот чалавек. Каб задаволіць удзел у драмгуртках усіх жадаючых, кіраўніцтва клуба стварыла тры драматычных групы і кожнай даручыла падрыхтаваць пастаноўку. Адна з іх у складзе 60 чалавек рыхтуе украінскую музыкальную камедыю «Сватанне на вечарніцы» Старадуба (кансультуюць артысты украінскага тэатра), другая рыхтуе п'есу «Пагранічнікі» Біль-Белацэркоўскага і трэцяя — «За радзіму» Львова. Значная частка актывістаў клуба прымае ўдзел у струнным аркестры, танцавальным калектыве і інш.

Значна папоўніў колькасць удзельнікаў самадзейнасці чыгуначны клуб станцыі Орша. Прыліў удзельнікаў даў магчымасць арганізаваць новы джаз-аркестр. Актыўна працуе драмгурток клуба, які падрыхтаваў п'есу Астроўскага «Васіліса Меленцьеўна». Кіруе гуртком стары рабочы-чыгуначнік, токар тав. Юр'еў. Тав. Юр'еў не толькі здольны рэжысёр, але і аўтар п'есы «На ўздыме», якая з поспехам была пастаўлена нядаўна на сцэне чыгуначнага клуба.

Вялікі прыліў удзельнікаў мастацкай самадзейнасці наглядаецца ў калгасах, у раённых цэнтрах У калгасе «Бальшэвік», Ліхачоўскага сельсовета, Гарадзкага раёна, па ініцыятыве комсамольцаў створан драмгурток. Кіруе гуртком настаўніца Драздоўская Арганізаван драмгурток у калгасе «Трэці з'езд Советаў», Казуліцкага сельсовета. Кіраўскага раёна Гуртком кіруе настаўнік тав. Падаляк. Створан драмгурток у калгасе імя Сталіна Грабянецкага сельсовета Чэрвеньскага раёна. Кіруе гуртком комсамолец Шыманскі. Пачаў працаваць драмгурток у калгасе імя Дзержынскага, Бокшыцкага сельсовета, Слуцкага раёна, і т. д. Створаны дзесяткі новых харавых гурткоў, танцавальных, музычных.

Некаторыя зрухі вызначаюцца і ў галіне рэпертуару Драмкалектывы нашых прадпрыемстваў, напрыклад, ужо не задавольваюцца аднаактнымі п'есамі. Яны імкнуцца аўладаць рэпертуарам нашых сталых тэатраў і часта не без поспеху. Так, драмгурток Магілеўскай шоўкавай фабрыкі імя Куйбышэва працуе над п'есай «Вочная стаўка» бр. Тур і Шэйніна. яўрэйскі драмгурток магілеўскай швейнай фабрыкі імя Валадарскага рыхтуе п'есу Шолам-Алейхема «Дзвесце тысяч» і г. д.

Імкненне да больш сур'ёзнага і складанага рэпертуару наглядаецца не толькі ў драмкалектывах прадпрыемстваў, маючых большыя магчымасці. Такая-ж тэндэнцыя ёсць і ў гуртках раённых дамоў соцкультуры. Так, драмгурток чырвонаармейскага Дома соцкультуры рыхтуе «Любоў Яравую» Трэнёва. «Мядзведзь» Чэхава, драмгурток веткаўскага Дома соцкультуры працуе над п'есай «Вочная стаўка» і г. д.

У рэпертуары харавога гуртка калгаса «Звязда», Залескага сельсовета, Чачэрскага раёна, — больш дваццаці песень, у тым ліку «Казачая песня» з оперы «Паднятая цаліна», «Суліко», «Ой, у лузе, лузе», «Песня 11-й арміі» і інш.

Рост колькасці ўдзельнікаў самадзейнасці, узбагачэнне рэпертуару — першы вынік падрыхтоўкі да трэцяй усебеларускай алімпіяды.

В. Д.

ЗАКОНЧЫЛІСЯ РАЁННЫЯ АЛІМПІЯДЫ

Закончыліся раённыя і гарадскія алімпіяды мастацкай самадзейнасці, на якіх адабраны лепшыя сілы для абласных і ўсебеларускай алімпіяд. Поўных даных аб выніках раённых алімпіяд яшчэ няма, але і папярэднія матэрыялы даюць падставу для некаторых вывадаў.

Першае, што адрознівае ўсе раённыя алімпіяды бягучага года ад папярэдніх, — гэта іх масавасць. У Заслаўскім раёне ў алімпіядзе прынялі ўдзел каля трохсот чалавек, у Барысаўскім — 524 Гарадокскім—145, Кагановіцкім раёне Менска — звыш 500 чалавек і г. д.

Другое. — на ўсіх алімпіядах выяўлена шмат новых мастацкіх калектываў, спевакоў, расказчыкаў, танцораў. У Заслаўлі агульную ўвагу выклікаў хор хатніх гаспадынь Дома соцкультуры ў складзе 23 чалавек, якім кіруе вучань 10 класа Фёдар Шчэрбіна. У рэпертуары хора — «Песня аб Сталіне», «Марш трактарыстаў», «На ўсход», «Ох ты, сэрца» і інш. Хор атрымаў другую прэмію. Першую прэмію атрымаў хор калгаса «Зара» Рогаўскага сельсавета трэцюю — хор калгаса імя Сталіна, Траскоўскага сельсовета, чацвертую — струнны гурток калгаса «Звязда» Старасельскага сельсовета.

У Барысаве першую прэмію атрымаў клуб прамкааперацыі, другую — клуб імя Горкага, трэцюю — педвучылішча.

Халопеніцкі раён да бягучага года ў алімпіядах не выступаў. Самадзейнасць там была закінутым участкам. Зараз зроблена першая спроба выявіць мастацкія сілы На раённай алімпіядзе прынялі ўдзел 18 чалавек, у тым ліку два невялікіх калектывы ў колькасці 9 чалавек.

У Крупскім раёне ў алімпіядзе ўдзельнічала 78 чалавек. Найбольшым поспехам карысталася музыкальная сям'я калгасніка Моніча з калгаса імя Першай пяцігодкі—Нацкага сельсовета.

У Гарадку першую прэмію атрымаў Дом соцкультуры, другую — музычна-танцавальны калектыў калгаса Вайханскага сельсовета. Вялікую цікавасць выклікала выступленне музыкальнай сям'і калгасніка Марозава з калгаса «Зара Леніна».

Усюды адзначаецца велізарная зацікаўленасць працоўных да мастацкай самадзейнасці. Клубы, дзе адбываюцца алімпіяды, перапоўнены гледачамі

Сёння 23 кастрычніка у Менску адкрываецца менская абласная алімпіяда мастацкай самадзейнасці.

ПАШЫРЫЦЬ КРЫТЫЧНЫЯ КАДРЫ

Пасля зацягнуўшагася летняга перапынку сабраўся, нарэшце, сход секцыі крытыкаў ССПБ

Дырэктар Інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР тав. Барысенка праінфарміраваў секцыю аб ходзе напісання гісторыі беларускай літаратуры. З інфармацыі высветлілася досыць непрыглядная карціна. Пераважная большасць напісаных па гісторыі нарысаў пры абмеркаванні ў інстытуце была падвергнута жорсткай крытыцы, як неадпавядаючая па сваёй якасці патрабаванням падручніка.

Паасобныя аўтары, якія далі згоду на ўдзел у напісанні гісторыі ў апошні час адмовіліся ад работы з прычыны перагрузкі, што зрывае своечасовую падрыхтоўку падручніка Гэтымі днямі, напрыклад, адмовіўся ад сваёй тэмы тав. Бядуля Секцыя папоўніла калектыў аўтараў гісторыі новымі таварышамі.

Секцыя зацвердзіла план работы на кастрычнік—снежань 1938 года. За гэты час мяркуецца заслухаць артыкулы пра «Будучыню» Самуйлёнка і «Кацярыну» Броўкі, пра паэзію Куляшова, пра творчасць Лынькова, пра спектакль «Кацярына Жарнасек», пра беларускую советскую драматургію і г. д.

Секцыя намеціла мерапрыемствы па пашырэнню кадраў крытыкаў. 28 кастрычніка бюро секцыі склікае нараду журналістаў і настаўнікаў, якія могуць быць прыцягнуты да крытычнай работы Для гэтых таварышоў намечана арганізаваць цыкл лекцый: гутарак па гісторыі крытыкі, аб працы над рэцэнзіяй крытычнымі артыкуламі.

Застаецца пажадаць секцыі крытыкаў выканання намечаных планаў

М. Н.

РАДЫЁКОНКУРС САМАДЗЕЙНАСЦІ

Радыёкамітэт пры СНК БССР у азнаменаванне XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі і XX-годдзя ленінска-сталінскага комсамола праводзіць радыёконкурс на лепшую мастацкую самадзейнасць. У конкурсе прымаюць удзел лепшыя калектывы і індывідуальныя выканаўцы мастацкай самадзейнасці дваццаці раёнаў рэспублікі.

Прайшоўшыя з 1 па 10 кастрычніка конкурсныя выступленні мастацкай самадзейнасці Менскай вобласці прадэманстравалі велізарныя поспехі ўдзельнікаў конкурса. У выступленнях прынялі ўдзел гурткі і паасобныя выканаўцы Менскага, Слуцкага, Барысаўскага, Заслаўскага і Капыльскага раёнаў, усяго 20 харавых і музычных калектываў і 25 індывідуальных выканаўцаў. Агульная колькасць удзельнікаў — 524 чалавекі.

Большасць выступленняў пакінула ў слухачоў вельмі добрае ўражанне. Асабліва трэба адзначыць выступленне хора заслаўскага Дома соцкультуры, харавых гурткоў арцелі «Перамога» і чыгуначнікаў Слуцка, духавых аркестраў завода імя Варашылава і клуба работнікаў асветы (Менск), паасобных выканаўцаў — тт. Бакшт з менскай друкарні імя Сталіна, Прыходзька і Васільевай (Менская міліцыя), Егуткінай і Дзятко з менскага клуба будаўнікоў, Іцінай з Барысава і інш.

Наогул трэба сказаць, што якасць выканання гурткоў самадзейнасці і іх рэпертуар былі значна лепшымі ў параўнанні з мінулым годам. На конкурсе быў прадэманстраван рад менскіх гурткоў, якія ў мінулым годзе не прынялі ўдзелу ў радыёфестывалі і іншых грамадскіх прагілядах. Напрыклад, духавы аркестр Дома работнікаў асветы, хор першага цагельнага завода, струнны аркестр школы міліцыі пад кіраваннем курсанта тав. Кожэва, хор і аркестр клуба будаўнікоў, хор і аркестр парыкмахераў і лазня-прачачных работнікаў.

Адначасова радыёконкурс выявіў, што некаторыя калектывы яшчэ недастаткова падрыхтаваны для выступленняў перад шырокай аудыторыяй. Гэта можна сказаць аб харавым гуртку завода імя Варашылава, аб струнным аркестры і некаторых салістах Барысава.

Радыёконкурс на лепшую мастацкую самадзейнасць праходзіць у перыяд падрыхтоўкі да трэцяй усебеларускай алімпіяды мастацкай самадзейнасці. Такім чынам, радыёконкурс павінен з'явіцца адным з асноўных мерапрыемстваў мабілізацыі лепшых сіл мастацкай самадзейнасці нашай рэспублікі да трэцяй усебеларускай алімпіяды.

Радыёконкурс дапамог выявіць, што ў некаторых гуртках справа падрыхтоўкі да алімпіяды абстаіць вельмі дрэнна. Самадзейнасць такіх прадпрыемстваў, як фабрыка «Окцябр», фабрыкі імя Кагановіча, «Кім», «Комунарка» і інш., зусім у радыёконкурс не ўключылася. Дырэктар культбазы Белкаапрамсовета тав. Жлановіч наогул адмовіўся выступіць у радыёконкурсе, патрабаваўшы за выступленні сваіх калектываў ганарар, матывіруючы гэта тым, што радыёкамітэт за слуханне атрымлівае грошы, таму калектыў дарма выступаць не будзе.

Не зусім добра абстаіць справа з асваеннем новага рэпертуару Рэпертуар большасці калектываў вельмі аднастайны Мімаволі ўзнікае пытанне, чаму гэта жаночы і мужчынскі хоры гомельскага завода імя Кірава здолелі асвоіць новы рэпертуар, у тым ліку і класічныя творы, а самадзейнасць самых буйных прадпрыемстваў Менска адстае?

Відаць, справа не толькі ў адсутнасці новага рэпертуару, а ў арганізацыі мастацкай самадзейнасці і кіраўніцтва ёю.

Таму трэба асабліва вітаць заклік народных артыстаў СССР тт. Масквіна і Барсавай аб шэфстве майстроў мастацтваў над калектывамі мастацкай самадзейнасці.

Радыёкамітэт за лепшае выкананне песень народаў СССР і твораў кампазітараў братніх рэспублік, за лепшае выкананне беларускіх народных песень і твораў беларускіх кампазітараў, за лепшую падрыхтоўку самадзейных гурткоў устанавіў каля 20 прэмій на агульную суму ў 4 000 рублёў.

Трэба спадзявацца, што радыёконкурс дасць новы штуршок развіццю мастацкай самадзейнасці і выявіць шмат новых здольных і выдатных самадзейных калектываў і салістаў.

С. М. РУДНІК.

ПОСПЕХ МАСТАЦКАЙ ВЫСТАЎКІ ВЫРАШАЕЦЦА СЁННЯ

А. ДАЛІН

Аб мастацкай выстаўцы 1940 г. нашы мастакі гавораць не без пачуцця трывогі ў голасе. Трывога зразумелая. У той час, як пісьменнікі, кампазітары і работнікі тэатраў Советскай Беларусі прарабілі ўжо нямалую работу па падрыхтоўцы да XX гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў, нашы жывапісцы і скульптары зрабілі вельмі мала. Падрыхтоўка да мастацкай выстаўкі 1940 года толькі цяпер пачынаецца, тады як творчыя работы над карцінамі і скульптурамі для гэтай выстаўкі трэба было пачаць ужо даўно. Зацяжка падрыхтоўчых работ можа прывесці да таго, што творчыя работы з-за недахопу часу будуць скамканы і выстаўка можа аказацца тэматычна няпоўнай, мастацка малакаштоўнай.

Што павінна паказаць мастацкая выстаўка? Яна павінна будзе адлюстраваць у фарбах і лепцы гераічную гісторыю барацьбы беларускага народа пад сцягам Леніна — Сталіна за сваю дзяржаўнасць, паказаць, як з дапамогай вялікага братняга рускага народа і ў творчым супрацоўніцтве з другімі народамі нашай вялікай социялістычнай радзімы Советская Беларусь стала шчаслівай і багатай, як пад зззяючым сонцам Сталінскай Канстытуцыі квітнеюць праца навука і мастацтва свабоднага беларускага народа.

Па новаму тэматычнаму плану, распрацаванаму спецыяльнай камісіяй Упраўлення па справах мастацтваў, асноўнай тэмай мастацкай выстаўкі павінна стаць: барацьба беларускага народа за сваю дзяржаўнасць; Ленін і Сталін, як стваральнікі гэтай дзяржаўнасці.

Тэма выстаўкі надзвычай сур'ёзная Яна патрабуе ад беларускіх жывапісцаў і скульптараў вялікага напружання творчых сіл. Ужо адзін той факт што нашым жывапісцам прыдзецца ў мастацкіх вобразах паказаць выдатную ролю ў барацьбе за перамогу Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі на Беларусі вялікіх правадыроў, як Ленін і Сталін, як іх выдатныя саратнікі — Свердлоў, Калінін, Кагановіч, Орджанікідзе, Варашылаў і Ежоў, гаворыць аб выключнай палітычнай адказнасці, якая ўскладаецца на арганізатараў выстаўкі і саміх мастакоў.

Адказнасць выключная і тым больш абавязваючая, паколькі часу да адкрыцця выстаўкі засталося мала Ад мастакоў патрабуецца не толькі жывапіснае і кампазіцыйнае ўменне, ім прадстаіць прарабіць вялікую і вельмі сур'ёзную работу па збіранню матэрыялаў для карцін, каб творы іх атрымаліся хвалюючымі, гістарычна праўдзівымі.

Тэматычны план, на наш погляд, зусім правільна намячае пачаць гістарычны раздзел з Кастрычніцкай рэволюцыі на Беларусі. Асобная карціна павінна паказаць М. В. Фрунзе як арганізатара разбраення паліцыі і арганізатара рабочай міліцыі. Дзве карціны прысвячаюцца барацьбе гомельскага пролетарыята і кіруючай ролі ў гэтай барацьбе Л. М. Кагановіча. Адна з карцін пакажа затрыманне і разбраенне карнілаўскіх эшалонаў у Гомелі пад кіраўніцтвам тав Кагановіча, другая пакажа тав. Кагановіча як арганізатара советскай улады ў Гомелі, у прыватнасці адлюструе выступленне тав. Кагановіча на сходзе Гомельскага совета 30 кастрычніка 1917 года.

Побач з карцінамі, якія паказваюць Н. І. Ежова на мітынгу чыгуначнікаў у Віцебску і выступленне С. К. Орджанікідзе з прывітаннем ад ЦК бальшэвіцкай партыі на другім франтавым з'ездзе арміі Заходняга фронта, асаблівую цікавасць прадстаўляе тэма, прысвечаная Я. М. Свердлову, яго дакладу на пасяджэнні ЦК 10 кастрычніка 1917 года аб гатоўнасці беларускага народа да ўзброенага паўстання. З якой хвалюючай праўдзівасцю і цеплынёй павінна быць напісана гэта карціна!

Рад карцін прысвячаецца барацьбе беларускага народа з нямецкімі і польскімі акупантамі. У ліку гэтых карцін: «Сталін у штабе Рэўваенсовета Заходняга фронта ў 1919 годзе» Роля таварыша Сталіна як арганізатара сіл Заходняга фронта перакліканецца з карцінай, прысвечанай Уладзіміру Ільічу Леніну, які выступае ў Маскве перад войскамі, ад'язджаючымі на польскі фронт. Развіццё гэтай тэмы павінна паказаць батальная карціна: «Разгром белапалякаў Чырвонай конніцай на чале з Будзённым». Заключнай карцінай будзе «Уступленне Чырвонай Арміі ў Менск». Карціна гэта пакажа радасную сустрэчу Чырвонай Арміі насельніцтвам горада.

Далей выстаўка пакажа, што кроў, пралітая нашымі людзьмі ў барацьбе з ворагамі рэволюцыі, не прайшла дарэмна, што беларускі народ, як і другія народы Советскай краіны, набыў у гэтай барацьбе сваё шчасце. Некалькі карцін прысвячаецца Сталінскай Канстытуцыі і выбарам у Вярхоўныя Советы Саюза і рэспублікі Адна з карцін прысвячаецца выступленню таварыша Варашылава ў Менску на стадыёне «Дынамо» перад сваімі выбаршчыкамі.

Гаспадарчы і культурны росквіт Советскай Беларусі будзе адлюстраван у радзе палотнаў аб новай калгаснай вёсцы, аб новых фабрыках і заводах, аб выдатных стахановцах горада і вёскі. Асобнае месца ў тэматыцы выстаўкі адводзіцца паказу гераічных подзвігаў доблесных пагранічнікаў, паказу гатоўнасці беларускага народа ў любую хвіліну стаць на абарону нашай вялікай социялістычнай радзімы.

Па глыбіні, па характару замыслу, гэта будзе выдатная выстаўка. Трэба толькі зараз-жа па-сапраўднаму ўзяцца за падрыхтоўку гэтай выстаўкі.

Першае, што неабходна зрабіць — гэта аформіць, нарэшце, выставачны камітэт. Начальнік Упраўлення па справах мастацтваў тав. Азірскі ўпэўнівае мастакоў, што выстаўком ужо існуе, аднак ніхто з мастакоў членаў гэтага выстаўкома ні разу не бачыў.

Трэба зараз-жа зацвердзіць тэматычны план выстаўкі, унёсшы ў яго, калі патрэбна будзе, адпаведныя папраўкі. Атрымаўшы зацверджаны план, выстаўком павінен у найкарацейшы тэрмін заключыць з жывапісцамі і скульптарамі індывідуальныя дагаворы на выкананне работ для выстаўкі. Зразумела, што размеркаванне заказаў трэба зрабіць з выключнай сур'ёзнасцю, адпаведна здольнасцям і вопыту кожнага мастака паасобку. Грошы на папярэдняе аванціраванне дагавораў у Упраўлення па справах мастацтваў даўно ёсць.

Зацвердзіць план, заключыць дагаворы — гэта толькі пачатак работы Галоўнае, — арганізацыйна і тэхнічна ўзначаліць усю работу па падрыхтоўцы да выстаўкі.

Вопыт мінулых выставак паказаў, што некаторыя нашы мастакі, прадастаўленыя самім сабе, незабяспечаныя неабходнай кансультацыяй па творчых пытаннях, не спраўляліся з узятымі на сябе абавязацельствамі. Успомнім хоць-бы карціну Е. Ціхановіча «Орджанікідзе ў разведцы». Гэта карціна мастака Ціхановіча можа быць аднесена толькі да ліку спроб вялікага сюжэтнага жывапісу, але не больш.

Улічваючы, што кадры нашых мастакоў хоць і шматлікія, але ў большасці сваёй яшчэ малакваліфікаваныя неабходна будзе прыцягнуць да работы над выстаўкай у якасці кансультантаў лепшых мастакоў Масквы і Ленінграда. Нічога заганага ў гэтым няма. Мы вучыліся і будзем вучыцца культуры і мастацтву ў вялікага братняга рускага народа.

Пажадана, вядома, каб усе работы да выстаўкі былі выкананы беларускімі мастакамі. Пажадана таксама заключыць дагаворы на 2 — 3 карціны і з лепшымі мастакамі Масквы і Ленінграда, што будзе спрыяць творчаму спаборніцтву паміж мастакамі і творчаму росту беларускіх мастакоў.

Работа над такімі вобразамі, як Ленін, Сталін, Свердлоў, над карцінамі гераічнай барацьбы беларускага народа супроць нямецкіх і польскіх акупантаў патрабуе ад мастакоў апрача жывапіснай тэхнікі велізарнага пачуцця гістарычнай праўдзівасці, вялікай творчай страсці. Для гэтага, апрача гарачай любві да свайго народа да сваёй социялістычнай радзімы, неабходна, каб мастакі глыбока ведалі гісторыю свайго народа, правільна арыентыраваліся ў паказваемых імі падзеях. Гэтага-ж ведання гісторыі, нажаль, нехапае некаторым нашым мастакам.

Не ўмеючы разабрацца ў гістарычных падзеях з марксісцкіх пазіцый, мастакі нярэдка трактуюць гэтыя падзеі як толькі псіхалагічны момант, стараючыся праз псіхалогію выклікаць любоў ці нянавісць да персанажаў карціны, не клапоцячыся аб гістарычнай праўдзе. Так, мастак М. Манасзон, працуючы над эскізам карціны «Акупанты» і жадаючы выклікаць нянавісць гледача да акупантаў, якія рабуюць беларускую вёску, ставіць у сваёй карціне беларускіх сялян на калені перад ворагам. разлічваючы праз гэту зняважу беларускіх сялян выклікаць нянавісць да акупантаў.

Калі-б Манасзон правільна арыентыраваўся ў гістарычных фактах, ён бы зразумеў, што, ставячы беларускіх сялян на калені перад ворагам, ён па сутнасці зневажае беларускі народ, той народ, справамі і самаахвярнай барацьбой якога супроць нямецкіх і польскіх разбойнікаў ён павінен ганарыцца як мастак советскага народа.

Трэба паказваць народ у яго гістарычнай праўдзе, у яго адважнай барацьбе з ворагамі і ў свяшчэннай нянавісці да ворагаў. Мы не супроць псіхалогіі. Калі ласка, стварайце глыбокія па псіхалагічнай трактоўцы карціны і вобразы, але не скажайце ў імя гэтай псіхалогіі гісторыю свайго народа.

Тут нельга абмяжоўвацца аднымі кансультантамі. Апрача таго, што кожны мастак павінен вывучаць гісторыю індывідуальна, пажадана, каб таварышы аўтарытэтныя ў пытаннях гісторыі беларускага народа, гісторыі Кастрычніцкай рэволюцыі, прачыталі мастакам рад грунтоўных лекцый.

Часу да адкрыцця выстаўкі засталося мала, а работу прадстаіць прарабіць велізарную. Цяжкасці непазбежны, але, як вядома, толькі ў барацьбе з цяжкасцямі нараджаецца сапраўднае мастацтва. Час яшчэ не прайшоў. У нас ёсць усе магчымасці стварыць тэматычную мастацкую выстаўку, вартую высокага і знамянальнага свята — XX гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў. Дабёмся таго, каб гэту выстаўку нам не сорамна было паказаць і Маскве, паказаць усяму вялікаму советскаму народу.

Нам. адказнага рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Т—5770